ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адзвел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ
27 красавіка 1930 г.
№ 98 (3606)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

НАЧНОЕ РАДЫЁ

Спроба узрыву адзкай машынай Савецкага паўпрэдзтва ў Варшаве

ВАРШАВА, 26. Сёньня пасьля абеду дворнік суседняга з паўпрэдзтвам дому на Пазнанскай вуліцы № 17 заўважыў, што праз страху перакінуты нейкі провад.

Пасьля дворнік заўважыў на страсе суседняга з паўпрэдзтвам дому зьвязаны провадав часавы мэханізм, ад якога провад праходзіў на страху будынку савецкага паўпрэдзтва. Дворнік паведаміў аб гэтым паліцыю, якая зьвярнулася да паўпрэдзтва з просьбай дазволіць прасачыць за провадам. У прысутнасьці прадстаўнікоў міністэрства замежных спраў, начальніка Усходняга аддзяленьня Галувкі і пракурора Розз вайсковыя кінотэхнікі выявілі, што провад быў з снарадам, які на тоўстым шнурку апушчаны быў у комін на доме савецкага прадстаўніцтва. Выцягнуць снараду не ўдалося. Прышлося ў сутарэньні паўпрэдзтва разабраць капітальную сьцяну і толькі пасьля гэтага з вялікімі намаганьнямі каля гадз. 7-й увечары дасталі снарад, дыямэтрам ў 12 сантымэтраў і даўжынёю 3,4 мэтра. Па словах спэцыялістых-тэхнікаў уся адзкая машына з тэхнічнага боку была як найлепей наладжана і мела вялізарную сілу.

Згодна папярэдняй ацэнкі, адзкая машына магла разбурыць увесь дом паўпрэдзтва. Снарад быў апушчаны з разьлікам, каб галоўнае вогнішча выбуху прымала на другі паверх, дзе жыве сям'я паўпрэдзтва. Выцягнутага снарада для дасьледваньня перавезьлі ў ваенна-тэхнічныя майстэрні. У суседнім з паўпрэдзтвам доме, са страхі якога быў праведзены провад да адзкае машыны, месьціцца клюб польскіх манархістых.

Напярэдадні 1-га мая ў краёх капіталу

ФАШЫСТЫЯ ЎЗМАЦНЯЮЦЬ ТЭРОР

Сотні арыштаваных у Варшаве і Львове

ВАРШАВА, 25. **У меру набліжэньня 1-га мая колькасьць арыштаў расьце з кожным днём. У Варшаве арыштавана звыш 100 чалавек. Сёньнішнія газэты паведамляюць аб масавых арыштах у Львове. На вагонабудаўнічым заводзе у Саноку дзе ў дзень 6-га сакавіка адбылася крывавая сутычка з паліцыяй, у сучасны момант праводзіцца зьніжэньне зарплаты больш чым на 22 проц. Тое самае адбываецца ў Олькушы, дзе таксама нядаўна адбыліся крывавыя падзеі. Адміністрацыя закрыла завод, заявіўшы, што ён будзе пушчаны ў ход толькі ў выпадку, калі рабочыя згодзяцца на значнае зьніжэньне зарплаты. (ТАСС).**

ПЛС ПАГРАЖАЕ КАМУНІСТЫМ КРЫВАВАЙ РАСПРАВАЙ

ВАРШАВА, 26. **Пэпэсэўскі орган «Работнік» пагражае камуністым крывавай расправаю, калі яны сьмілівуць сваю дэманстрацыю на Грыбовым пляцу, дзе штогодна на працягу апошніх год праходзілі камуністычныя першамайскія дэманстрацыі. (ТАСС).**

НОВЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 25. Паведамляюць аб новых выступленьнях беспрацоўных у **Чэнстахове, Петракове, Рыпіне, Ловічы.** Ва ўсіх гэтых гарадох беспрацоўныя прабавалі прабрацца ў памяшканьне магістрату. У часе сутычкі паміж беспрацоўнымі і паліцыяй у Чэнстахове паранены адзін паліцэйскі.

КАМПАРТЫЯ ФРАНЦЫІ ЗАКЛІКАЕ ДА ЎСЕАГУЛЬНАЙ ЗАБАСТОЎКІ І-ГА МАЯ

ПАРЫЖ, 26. «Юманітэ» апублікавала першамайскую адозву кампартыі і ўніцарнай канфэдэрацыі працы.

У адозьве зазначаецца, што на агульным фоне ведьмі вострага эканамічнага крызісу ў Францыі амаль таксама адзначаецца ўзмацненьне аднак наступных зьявішч: скарачэньне многімі прадпрыемствамі ліку занятых рабочых і шырокае прыстасаваньне ў радзе асноўных прамысловых галін нянаўнага рабочага тыдню Барацьба за рынкі выліваецца ў падрыхтоўку вайны. **Францыя за апошні год павялічыла свой вайсковы бюджэт на паўтары мільярды франкаў.** Са страхам пазіраючы на пераможнае будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, які праз некалькі год абгоніць самыя перадавыя капіталістычныя краі, невылячальна хворы капіталізм рыхтуе вайну супроць Савецкага Саюзу.

Адозва адзначае, што цкаваньне Савецкай улады, узьнятае ў сувязі з кампаніяй **аб тым, як ідзе засеў гароднины.** СНК канстатуе, што гародняя кампанія ў БССР праходзіць нездавальняюча. Садова - гародняй і паляводнай каапэрацыяй ня былі ўжыты адпаведныя захады для свачасовай загатоўкі насеньня гароднины ў межах БССР, з прычыны чаго не хапае такіх культур, як цыбуля, гарох, фасоля і інш. Белкалгассаюз не зьвярнуў патрэбнай увагі на заключэньне дагавароў па кантрактацыі гароднины, у выніку чаго затрымліваецца свачасовае выкананьне пляну кантрактацыі. Акруговыя зямельныя аддзелы і гарадзкія саветы не адвялі свачасова зямельных вучасткаў пад прамысловыя гароды, спажывецкай каапэрацыі і інш. арганізацыям. Некаторыя ўстановы, як аб'яднаньне харчовай прамысловасьці пры ВСНГБ і Прадукт-Пераапрацоўка дасюль не заключылі дагавору з Белсадкалгассаюзам на патрэбную ім садавіну.

У мэтах зьніжэньня паказаных вышэй недахопаў СНК БССР пастанаўляе даручыць усім акруговым выканаўчым камітэтам, і абавязаць гарадзкія саветы і мясцовыя зямельныя органы ў 5-дзённы тэрмін зрабіць адвод спажывецкай каапэрацыі і інш. установам адпаведных па разьмерах і якасьці зямельных вучасткаў у гарадох і прыгарадных раёнах пад прамысловыя гароды.

Белпаляводсаюзу і Белкалгассаюзу СНК даручыў скончыць выкананьне пляну кантрактацыі на гародніне і сталовай бульбе да 1-га мая 1930 году і адначасова праверыць усе раней заключаныя дагавары з пасеўшчыкамі.

Аб'яднаньню харчовай прамысловасьці пры ВСНГБ прапануецца неадкладна заключыць дагавор з Белсадкалгассаюзам на шматгадовую кантрактацыю садавіны.

З прычыны пястачы насеньня некаторых гародніх культур Белсадкалгассаюзу запрапанавана рацыянальна скарыстаць насеньне, якое ёсьць, пры чым, у патрэбных выпадках дапускаць замену пасеву адных культур другімі.

Праз месяц СНК зноў заслухае даклад НКЗ аб выкананьні пасеўнай і гародняй кампаніі.

З ПАСЕЎНАГА ФРОНТУ

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва—

найлепшы шлях да перавыкананьня пасеўных плянаў

Лён—пагражальны вучастак пасеўнага фронту.—Калгасьнікі і індывідуальнікі, змагайцеся за пашырэньне пасеву ільну

ЗАВОД--КАЛГАСУ

КАЛГАСНЫ КУСТ «КАМУНАР» ПЕРАЙМАЕ ВОПЫТ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА ЗАВОДУ «КАМУНАР»

Гэтымі днямі ў «Зьвязьдзе» паведамлялася аб пачынаньні рабочых менскага мэталязаводу «Камунар». Гэты завод узяўся за арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва ў падшэфным яму аднайменным кусьце калгасаў у Бабаўнянскім сельсавеце, Капыльскага раёну, пры чым, ён абавязаўся дапамагчы калгасам арганізаваць працу і вытворчасьць на падставе свайго багатага вытворчага вопыту.

Уступленьне ў сацыялістычнае спаборніцтва калгасаў кусту «Камунар» паміж сабой узьняло баявы настрой усіх, без выключэньня, калгасьнікаў. Ніколі яшчэ да гэтага часу не паглядалася тут, у гэтым глухім кутку Беларусі, які знаходзіцца на самай савецка - польскай мяжы, такой актыўнасьці беднякоў і сераднякоў.

Масавая праца шэфаў - рабочых заводу «Камунар» натыкалася тут на асабліва цяжкія ўмовы. Амаль усе цяперашнія беднякі і сераднякі Бабаўнянскага сельсавету былі да 1919 году батракамі ў польскага паменшчыка Барнацкага, зьвера і эксплёататара.

Савецкая ўлада дала гэтым батракам зямлю, дапамагла стаць на ногі, але цемра і невуцтва, гэтая панская спадчына, яшчэ і зараз не зьліквідавана дашчэнту. Вось чаму дасягнутыя рабочымі - шэфамі вынікі заслугоўваюць асаблівай увагі. Калгасы кусту растуць павольна, але пэўна. Штодзенна ў кожны калгас уступае 1-2 новыя члены. Калгас «Чырвоны Пуціловец» за апошні час вырас з 6 да 50 гаспадарак.

Калгасьнікі разьбіты па брыгады.

Яшчэ сацдагавор не падпісаны, а ў калгасах ужо створаны ўдарныя брыгады, якія працуюць сапраўды паўдарнаму.

Неабходна адзначыць, што зрух у Бабаўнянскім сельсавеце ў значнай частцы дасягнуты ў выніку кіпучай дзейнасьці старшыні сельсавету — рабочага заводу «Камунар» тав. Марголіна, які карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод сялян.

Калгасьнікі і шэфы-рабочыя энэргічна рыхтуюцца да 1-га мая. На гэты дзень у Бабоўні назначана афіцыйнае падпісаньне сацыялістычнага дагавору паміж калгасамі і заводам.

Пасьля ўважлівага і ўдумлівага абмеркаваньня калгасьнікі гэтымі днямі прынялі праект сацыялістычнага дагавору, у якім прадугледжваецца абавязковае папырэньне яравога клину на 15 проц., ажыцьцяўленьне раду аграмерапрыемстваў, поўная ліквідацыя нянісьменнасьці і г. д.

Рабочыя заводу «Камунар» бяруць па сябе абавязак пя толькі перавыкананць свой прамфінплян, але і кіраваць арганізацыяй працы і вытворчасьці ў калгасах, дапамагчы ліквідаваць нянісьменнасьць сярод калгасьнікаў на працягу аднаго году і наогул узьняць іх культурны ўзровень.

У якасьці першамайскага падарунку завод «Камунар» пасылае падшэфным калгасьнікам супроцьпажарнае абсталяваньне і дзьве малатарні.

На першамайскае сьвята ў Бабоўню выяжджае дэлегацыя камунараўцаў, якая будзе ажыцьцяўляць тое, што абавязаўся рабіць завод «Камунар».

У Менск-жа на першамайскае сьвята прыяжджае дэлегацыя калгасьнікаў кусту «Камунар», якая на практыцы будзе знаёміцца з арганізацыяй вытворчасьці на заводзе.

У 5-ДЗЁННЫ ТЭРМІН СКОНЧЫЦЬ АДВОД ЗЯМЛІ ДЛЯ ГАРОДАЎ ДА І-ГА МАЯ СКОНЧЫЦЬ КАНТРАКТАЦЫЮ ГАРОДНІНЫ

ПАСТАНОВА СНК БССР

СНК БССР заслухаў даклад уноўнаважанага на правяденьні с.-г. кампаніі аб тым, як ідзе засеў гароднины. СНК канстатуе, што гародняя кампанія ў БССР праходзіць нездавальняюча. Садова - гародняй і паляводнай каапэрацыяй ня былі ўжыты адпаведныя захады для свачасовай загатоўкі насеньня гароднины ў межах БССР, з прычыны чаго не хапае такіх культур, як цыбуля, гарох, фасоля і інш. Белкалгассаюз не зьвярнуў патрэбнай увагі на заключэньне дагавароў па кантрактацыі гароднины, у выніку чаго затрымліваецца свачасовае выкананьне пляну кантрактацыі. Акруговыя зямельныя аддзелы і гарадзкія саветы не адвялі свачасова зямельных вучасткаў пад прамысловыя гароды, спажывецкай каапэрацыі і інш. арганізацыям. Некаторыя ўстановы, як аб'яднаньне харчовай прамысловасьці пры ВСНГБ і Прадукт-Пераапрацоўка дасюль не заключылі дагавору з Белсадкалгассаюзам на патрэбную ім садавіну.

У мэтах зьніжэньня паказаных вышэй недахопаў СНК БССР пастанаўляе даручыць усім акруговым выканаўчым камітэтам, і абавязаць гарадзкія саветы і мясцовыя зямельныя органы ў 5-дзённы тэрмін зрабіць адвод спажывецкай каапэрацыі і інш. установам адпаведных па разьмерах і якасьці зямельных вучасткаў у гарадох і прыгарадных раёнах пад прамысловыя гароды.

Белпаляводсаюзу і Белкалгассаюзу СНК даручыў скончыць выкананьне пляну кантрактацыі на гародніне і сталовай бульбе да 1-га мая 1930 году і адначасова праверыць усе раней заключаныя дагавары з пасеўшчыкамі.

Аб'яднаньню харчовай прамысловасьці пры ВСНГБ прапануецца неадкладна заключыць дагавор з Белсадкалгассаюзам на шматгадовую кантрактацыю садавіны.

З прычыны пястачы насеньня некаторых гародніх культур Белсадкалгассаюзу запрапанавана рацыянальна скарыстаць насеньне, якое ёсьць, пры чым, у патрэбных выпадках дапускаць замену пасеву адных культур другімі.

Праз месяц СНК зноў заслухае даклад НКЗ аб выкананьні пасеўнай і гародняй кампаніі.

Зараз-жа разьмеркаваць завезенае насеньне і ўгнаеньне

ТЭЛЕГРАМА Т. РАЧЫЦКАГА

У «Зьвязьдзе» паведамлялася ўжо, што ў радзе раёнаў затрымліваецца разьмеркаваньне і рэалізацыя завезенага насеньня і ўгнаеньня. У сувязі з гэтым НКЗ БССР т. Рачыцкім разаслана тэлеграма ўсім упоўнаважаным па пасеўкампаніі, у якой катэгарычна прапануецца шырока інфармаваць бядняцка-серадняцкія масы сялянства аб адмене гатункоўкага насеньня пуд за пуд і прапануе прыняць меры да поўнага разьмеркаваньня паміж пасеўшчыкамі ўсяго завезенага, загатаванага насеньня і мінэральных угнаеньняў.

Тав. Рачыцкі прапануе зараз-жа арганізаваць праверку рэалізацыі насеньня і ўгнаеньня і ўстанавіць пэрсанальную адказнасьць за гэту справу.

Шырока папулярызаваць дадатковыя ільготы калгасам

Старшынёй Белкалгасцэнтру т. Міцькоўным разаслана тэлеграма ўсім акркалгассаюзам, у якой ён прапануе шырока растлумачыць бядняцка - серадняцкім масам сялянства і калгаськікам пра дадатковыя ільготы калгасам, апублікаваныя ў друку 24-25 красавіка, па крэдытаваньні, кантрактацыі, вызваленьні ад самаабкладаньня, аб с.-г. падатку і насеннай дапамозе.

Тав. Міцькоў прапануе акруговым калгассаюзам скарыстаць гэтыя ільготы для замацаваньня і далейшага пашырэньня калектывізацыі. Тав. Міцькоў зварачае ўвагу акруг на неабходнасьць праверкі выкананьня дырэктывы аб ільготах, у прыватнасьці, водпуску крэдытаў нізавой сеткі і выдачы пазык на набыцьцё насеньня ільну.

Менакрэа 17 дзен не выкупляе замежных с.-г. машын

8-ГА КРАСАВІКА З-ЗА МЯЖЫ, ПРАЗ НЕГАРЭЛЬСКУЮ МЫТНІЦУ, ПРЫБЫЛІ НА СТ. МЕНСК ДЛЯ МЕНСКАГА АКРЭА 4 СКРЫНІ З С.-Г. МАШЫНАМІ І ПРЫЛАДАМІ. ГРУЗ ПАСЛАНЫ ВЯЛІКАЙ ХУТКАСЬЦЮ, ДЛЯ ПАТРЭБ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

НАПЭЎНА НАШЫ ЗАМЕЖНЫЯ ГАНДЛЁВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ЗРАБІЛІ ЎСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ ХУТЧЭЙ ВЫКАНАЦЬ ЗАКАЗ І ЗАДАВОЛІЦЬ ПАТРЭБЫ МЕНСКАЕ АКРУГІ Ў С.-Г. МАШЫНАХ. МІЖ ТЫМ, ПРАЙШЛО ЎЖО 17 ДЗЁН, А ГРУЗ ЛЯЖЫЦЬ НА СТАНЦЫІ НЕВЫКУПЛЕНЫМ.

ПАТРЭБНА ЎМЯШАНЬНЕ ОРГАНАЎ РСІ, КАБ СКОНЧЫЦЬ З ТАКІМІ АГІДНАСЬЦЯМІ І ПРЫЦЯГНУЦЬ ВІНАВАТЫХ ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

АПЭРАЦЫЙНЫЯ ЗВОДКІ З ГАСПАДАРЧАГА ФРОНТУ

Прыклад ударнікаў лушчыльнага аддзяленьня

Павысілі сваю норму на 7 проц.

Ударнікі лушчыльнага аддзяленьня фанэрнага цэху Бабруйскага камбінату т. т. **А. Дагор, Сьмілавіцкі, Плоткін, Ліфшыц, Гонікман, Казёл, Кацман, Садоўскі і З. Левін,** якія даўно ўжо ідуць упередзе ўсіх у выкананьні пляну, падалі 22 красавіка наступную заяву ў прафцэхбюро:

«Прымаючы пад увагу важнасьць выкананьня прамфінпляну, як па колькасьці, так і па якасьці яго, і зьніжэньне сабекошту, што дае магчымасьць адпаведным чынам разгарнуць нашу работу і выканаць пяцігодку ў чатыры гады, наперакор трусьлівым і малаверам, просім адміністрацыю і цэхпрафбюро дадаць да нашай нормы 100 лістоў на варштат (што складае 7 проц.)».

Гэтыя ўдарнікі — кадравыя рабочыя, якія ніколі не цягнуліся ў хвасьце, ня ведалі і ня ведаюць ніякіх «аб'ектыўных» прычын. Іх прыклад, бязумоўна, знойдзе жывы водгук сярод рабочых камбінату, якія вядуць вялікую барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

А. МАГІДАЎ.
І. ДЗЕЛЯНДОЎ.

Напярэдадні пералому

РАБОТА ЛЕСАЦІЛЬНАГА ПЭХУ БАБРУЙСКАГА КАМБІНАТУ ПАЛЯПШАЕЦЦА З КОЖНЫМ ДНЁМ. РАБОЧЫЯ ПРАЯЎЛЯЮЦЬ МНОГА ЭНЭРГІІ Ў СПРАВЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ НЕДАХОПАЎ. САЦСПАБОРНІТВА РАЗГОРТВАЕЦЦА. КАЛЯ КОЖНАГА ВАРШТАТУ ВЫВЕШАНЫ ДЫЯГРАМЫ ШТОДЗЕННАЙ ВЫПРАЦОЎКІ КОЖНАГА РАБОЧАГА І ВАРШТАТУ. ПА НЕКАТОРЫХ ВАРШТАТАХ КРЫВАЯ ДЫЯГРАМЫ ІДЗЕ ЎВЕРХ.

ЗА АПОШНІ МЕСЯЦ ЦЭХ МАЕ РАД ДАСЯГНЕНЬНЯЎ. ВЫТВОРЧАЯ ПРАГРАМА ВЫКАНАНА З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ. ЗАДАНЬНЕ ПА ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ ПРАЦЫ ТАКСАМА ПЕРАВЫКАНАНА: ЗАМЕСТ 1.51 КУБ. МТ. НА ЧАЛАВЕКА, НАВОДЛЕ ПЛЯНУ, ВЫПРАЦОЎВАЕЦЦА 1,76 КУБ. МТ. НА ЧАЛАВЕКА.

АЛЕ ДРЭННА ЯШЧЭ СТАЦЬ СПРАВА З ВЫКАНАНЬНЕМ ЭКСПАРТНАГА ПЛЯНУ, ЯКІ ЗА ПЕРШЫ КВАРТАЛ ВЫКАНАНЫ НА 55 ПРОЦ. А ЗА ДРУГІ—НА 88 ПРОЦ. ЦЭХАВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ЎЗМАЦНІЦЬ СВАЮ РАБОТУ.

Брыгада «Зьвязды»: Фалько, Галоўкін, Магідаў.

Брыгада „Зьвязды"—на барацьбу за прамфінплян!

Мазырская фанэрная фабрыка «Чырвоны Кастрычнік» за другі квартал НЕДАВЫКАНАЛА вытворчай праграмы на 9,95 проц., а па экспартнай фанэры — на 12,85 проц. ПЕРАВЫДАТАК СЫРЦУ на 1 куб. мэтр, у параўнаньні з плянам, складае 10 проц. Прадукцыйнасьць працы НІЖЭЙ ПЛЯНАВЫХ МЕРКАВАНЬНЯЎ на 13,87 проц. Сабекошт зьніжан усяго НА 1,5 ПРОЦ., замест плянавага заданьня ў 10,5 ПРОЦ.

Аскоўныя прычыны прарыву наступныя: ПРАМФІНПЛЯН ДА ЦЭХУ НЕ ДАВЕДЗЕН. Зводкі аб ходзе выкананьня прамфінпляну ня вывешваюцца. Няма дакладнага ўліку выпрацоўкі пасабовых цэхаў. На фабрыцы не праведзена правільная тарыфікацыя рабочых.

Многа добрых шпонаў ідзе ў топку.

Фабрыка з 1-га мая павінна быць пераведзена НА 7-ГАДЗІННЫ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ, АЛЕ ПАДРЫХТОЎЧАЯ РАБОТЫ ДА ПЕРАВОДУ НЕ ПРАВЕДЗЕНА НІЯКАЙ. На дварэ ляжыць у беспарадку цэгла, іржавеюць жалезныя балькі. На складах, дзе ляжыць гатовая да адпраўкі фанэра, таксама вялікі беспарадак.

На фабрыцы вылучана РАБКОРАЎСКАЯ БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ». Брыгада паабіцца разгарнуць шырокую хвалю самакрытыкі недахопаў работы фабрыкі і ўдарна змагацца за прамфінплян.

Я. СТРЫНСКІ.

З КАГО ТРЭБА БРАЦЬ ПРЫКЛАД

Першы квартал на Нова-Барысаўскім заводзе імя Розы Люксэмбург закончыўся прарывам. Вытворчая праграма была недавыканана на 5,2 проц. **Партячэйка** адразу-ж мабілізавала увагу рабочых па ліквідацыю прарыву. **Уся ячэйка абвясьціла сябе ўдарнай.** Рабочыя **пайшлі па прыкладзе камуністых.** Заўкома для кожнай ударнай брыгады выпрацаваў **канкрэтныя заданьні па дзесяцідзёўках.** Кожны месяц адміністрацыя на агульных сходах рабіла справаздачы аб рабоце заводу. Быў праведзен рад вытворчых нарад. Выкананьне 3-х прапанаў **ударнікаў** прынесла заводу **звыш 3.000 руб. эканоміі ў месяц.**

І вось, дзякуючы напружанай рабоце партыйнай і прафэсіянальнай арганізацыі, дзякуючы **энэргіі рабочых,** прарыву ў другім квартале цалкам ліквідаваны. Вытворчая праграма за наўгодзьдзе выкананa **на 102 проц.** Сабекошт замест 5 руб. 33 к. куб. мэтр, складае 5 руб. 13 кап.

Калектыў заводу імя Розы Люксэмбург наказаў, што можна зрабіць пры належных адносінах і зацікаўленасьці вытворчасьцю.

П. КАРАЛЁЎ.

Прывітаньне тав. Сталіна

Першаму выпуску прамакадэміі

МАСКВА, 25. Выпрацоўка новых кадраў сацыялістычнай прамысловасьці з людзей рабочае клясы, здольных кіраваць прадпрыемствамі як грамадзка-палітычна, так і вытворча-тэхнічна, зьяўляецца першачарговай задачай моманту. Без выкананьня гэтай задачы немагчыма ажыцьцявіць пераўтварэньне СССР з краю адсталага ў край перадавы, з краю аграрнага ў край індустрыяльны, у край электрыфікацыі і мэталю, у край машын і трактараў. Прамакадэмія ёсьць адна з важнейшых пунктаў нашага краю па выпрацўцы такіх кадраў. Першы выпуск прамакадэміі ёсьць першая яе страла, пупчаная ў лягер нашых ворагаў, у лягер вытворчай рутыны і тэхнічнай адсталасьці. Будзем спадзявацца, што новыя кіраўнікі прамысловасьці, якія пакідаюць сёньня сьцены акадэміі, дакажуць па справе ўзоры працоўнага энтузіязму і сапраўдна-рэвалюцыйнай работы па правядзеньні ў жыцьцё бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва.

Прывітаньне першаму выпуску прамакадэміі, якая дае краіне новых, палкаваны тэхнічнымі ведамі, бальшавіцкі атрад кіраўнікоў нашай сацыялістычнай прамысловасьці.

І. Сталін.

ПРЫВІТАНЬНЕ ТАВ. РЫКАВА

МАСКВА, 26. У прывітаньні гаворыцца:

«У цяперашні момант, калі СССР перажывае багатую буйнымі посьпехамі і ў той-жа час трудную паласу разьвіцьця, перамагаючы над кіраўніцтвам нашай камуністычнай партыі немалыя перашкоды, зьвязаныя з гаспадарчай, тэхнічнай і культурнай адсталасьцю краю, калі ходам сацыялістычнай рэканструкцыі пастаўлена ва ўвесь рост праблема інжынэрна-тэхнічных і гаспадарчых кадраў,—у такі іменна момант папаўненьне арміі будаўнікоў сацыялізму новым атрадам сваіх, камуністычных спэцыялістых, якія адзначаюцца вытрыманасьцю, навуковымі ведамі і вопытам практычнай работы, зьяўляецца важнай падзеяй. Першы выпуск Прамакадэміі — новы і значны крок на шляху стварэньня кадраў для кіраваньня нашай сацыялістычнай прамысловасьцю. **Пачын зроблены вялікі** і я не сумняваюся ў вялізарнейшым посьпеху, з якім ён будзе закончаны. Я не сумняваюся ў тым, што кожны з вас у сваёй далейшай рабоце ўвесь свой практычны вопыт і тэарэтычныя веды, усю сваю рэвалюцыйную сілу ўложыць у справу сацыялістычнага будаўніцтва, за якую мы будзем змагацца як бальшавікі-рэвалюцыянэры.

Мае гарачае камуністычнае прывітаньне і пажаданьне посьпеху.

А. І. РЫКАЎ.

Напружанае становішча ў Індыі

СТАНОВІШЧА З КОЖНАЙ ГАДЗІНАЙ ПАГАРШАЕЦЦА

ЛЁНДАН, 25. Паводле вестак агенцтва «Райтэра» з Сімлы, індыйскія ўлады расцэньваюць становішча ў Індыі надзвычай сур'ёзна. Адтуль эвакуваны ўсе жанчыны і дзеці. Чакаецца спыненьне водпускаў вайскоўцам за межы Індыі.

***

ЛЁНДАН, 25. Ангельскія ўлады ў Індыі і ангельскі буржуазны друк выказваюць усё больш моцную трывогу з поваду індыйскіх падзей. Бамбэйскі карэспандэнт «Дэйлі Ньюз» прызнае, што становішча ва ўсёй Індыі з кожнай гадзінай пагаршаецца і што падзеі ў Пэшэвары зрабілі моцнае ўражаньне на індыйскую грамадзкасьць. Паводле слоў карэспандэнта, дакладны лік ахвяр у Пэшэвары, «як відаць, значна большы, чым гэта фігуравала ў друку». Адзін з выдатных удзельнікаў крывавай бойкі ў Арміцары ў 1919 годзе, у часе тагочаснага Гандзісцкага руху, заяўляе, што ангельская ўлада ў Індыі стаіць перад такой сур'ёзнай пагрозай, якой яна ня ведала з часу паўстаньня ў 1857 годзе. Ён лічыць патрэбным стаць на шлях самых рашучых дзеяньняў для выкараненьня «мецяжу».

Камуністычны орган «Дэйлі Уоркер» вітае бліскучую барацьбу індыйскіх рабочых і сялян супроць грубога гвалту лейбарысцкага ўраду.

ЛЁНДАН, 25. Лёканічныя афіцыёзныя паведамленьні, якія прабіваюцца ў буржуазнай прэсе адносна падзей у Пэшэвары, даюць падставу меркаваць, што там была нападжана крывавая бойня, з мэтаю задушэньня рэвалюцыйнага руху. Усё белае насельніцтва папярэдня было эвакуавана. Ва ўсе навуковыя ля Пэшэвару раёны зараз сьцягваюцца вайскі. Індыйскі ўрад сьпішна фармуе новыя атрады, дапаўняе існуючыя вайсковыя часьці і выстаўляе ўзмоцненую ахову ўсіх мастоў і дарог. (ТАСС).

РАССТРЭЛ СЯЛЯН У ІНДЫІ

ЛЁНДАН, 25. Паводле паведамленьня агенцтва «Рэйтэр» з Калькуты, каля 2.000 сялян сабраліся ў Нілі дайамонд. Паліцыя абвясьціла сход незаконным і загадала сялянам разыйсьціся. Сяляне адмовіліся падпарадкавацца загаду і асыпалі іх градам каменьняў, параніўшы 16 паліцэйскіх. Паліцыя адкрыла на сялянах агонь. Паранены 3 чалавекі. Адзін сялянін забіты папавал.

ЦЭНЗУРА ІНФАРМАЦЫІ Ў ІНДЫІ

ЛЁНДАН, 26. Весткі аб тым, што інфармацыя з Індыі цэнзуруецца, выклікаюць пратэсты некаторых буржуазных газэт, у тым ліку «Дэйлі Гэральд». «Дэйлі Гэральд» піша, што бліжэйшыя месяцы ў Індыі будуць поўны сусьветнага гістарычнага значэньня, а таму неабходна, каб для ангельскай грамадзкай думкі не прападала ні ўсё колькі-небудзь значнай інфармацыі з Індыі. Лібэральны орган «Дэйлі Ньюз» піша, што трэба неадкладна зьвярнуць сур'ёзную увагу на такую інфармацыю з Індыі, калі [illegible] аб апярэдніх падзеях будуць систэматычна затрымлівацца і скажацца, то гэта можа мець катастрафічныя палітычныя вынікі. У гэтым выпадку ангельскаму народу пагражае небясьпека раптоўна стаць перад вялізнымі падзвычайна сур'ёзнымі становішчамі.

(ТАСС).

БУРНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ КАМУНІСТЫЧНЫХ ДЭПУТАТАЎ У ЧЭХА-СЛАВАЦКІМ ПАРЛЯМАНЦЕ

ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ РАССТРЭЛУ ДЗІЦЯЧАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў РАДОЦІНЕ

ПРАГА, 25. На ўчарайшым пасяджэньні чэхаславацкага парляманту адбыліся бурныя выступленьні камуністычных дэпутатаў, у сувязі з крывавымі падзеямі ў Радоціне (Радоцін прыгарад Прагі), дзе 20 красавіка, у часе дэманстрацыі камсомолу жандармэрыяй было паранена 5 чалавек. Камуністычныя дэпутаты Хіжымская і Гадзінана прарваліся да дому прэм'ера Ўдржала, дэманстрыруючы пакрываўленую жанчыну. З прамоваю аб падзеях у Радоціне выступіў камуністычны дэпутат тав. **Капецкі.**

«Падзеі ў Радоціне, — сказаў т. Капецкі, — зьяўляюцца адным са зьвеньняў тае сыстэмы, якая расстрэлівала бастуючых рабочых шкляной прамысловасьці, якая крывава душыла выступленьні беспрацоўных і рабочых 6 сакавіка, якая забараняе і разганяе рабочыя сходы».

Далей Капецкі нарысаваў сапраўдны малюнак падзей 20 красавіка. «Дэманстрацыя моладзі і дзяцей, — падкрэсьліў тав. Капецкі — мела культурны характар. У праграму уваходзілі футбольныя спаборніцтвы і вечар з гульнямі. Наперадзе дэманстрацыі ішлі дзеці, бо ніхто ня думаў, што жандарм будуць страляць у дзіцячую дэманстрацыю. Я ішоў у першых радох і сьцьвярджаю, што правае крыло жандарскага кардону, якое знаходзілася на адлегласьці 15 крокаў, дало залп бяз усякага папярэджаньня. Выстралы былі зробленыя вучэбнымі кулямі, але, як відома, раніць цела. Абвяргаючы цьверджаньні сацыял - фашысцкага і буржуазнага друку, заявіўшых, што камуністы нібы не дапамагалі параненым, Капецкі расказвае, што іменна камуністы пачало з ім, зараз-жа пасьля выстрылу, прасіліся да раненых. Жандары не дазвалі прыбіраць з бруку пакрываўленых дзяцей, праяжджаючы санітарны аўтамабіль адмовіўся быў узяць параненых.

Мы патрабуем стварэньня камісіі з рабочых, выбраных на заводах, прадстаўнікоў МОПР'у і прадстаўнікоў прафсаюзаў для расьсьледваньня расстрэлу дэманстрантаў. Гэта камісія павінна дасьлічаць на правах парляманцкай камісіі. Мы патрабуем неадкладнай адстаўкі ўраду і аддачы яго пад суд». Капецкі адзначыў, што рабочыя ўжо адказалі на падзеі ў Радоціне дэманстрацыямі.

(ТАСС).

РАСПРАВА ЮГА-СЛАЎСКАГА ФАШЫЗМУ НАД ХАРВАЦКІМІ ДЗЕЯЧАМІ

БУЙНЫ ПАЛІТЫЧНЫ ПРАЦЭС У БЕЛГРАДЗЕ

ВЕНА, 25. Учора ў Вярхоўным судзе Белграду пачаўся буйны палітычны працэс былога харвацкага лідэра **Магеса і 23 яго таварышоў.** Падсудныя абвінавачваюцца ў змове супроць дзяржавы, з мэтаю адарваньня Харватыі ад Юга-Славіі, а таксама ў стварэньні тэрарыстычнай арганізацыі, спробах замахаў і незаконным хапаньні зброі і выбуховых рэчаў. Падсудных абаранае 27 адвакатаў. Перад працэсам 153 харвацкіх адвакаты і палітычныя дзеячы запрапанавалі падсудным бясплатна свае паслугі па абароне, але суд не дапусьціў іх да абароны.

Абвінавачаньне выклікае на суд усяго 6 сьведак, выключна дзяржаўных служачых. Для працэсу выбрана цеснае памяшканьне, дзе ледзь зьмяшчаюцца суд, абвінавачаныя, варта і толькі частка абароны. На ўчарашнее першае пасяджэньне публіка дапушчана ня была. Былі дапушчаны толькі некалькі Юга-слаўскіх і 3 замежных журналістыя. Прапанова абароны аб дапушчэньні стэнаграфічнай запісі працэсу адхілена судом.

Зьяўленьне

Мабілізуем масы на выкананьне задач культурнай рэвалюцыі

Выканаем культурную пяцігодку

Лёзунг культурнай рэвалюцыі зьяўляецца арганічнай часткай лёзунгу ўсёй сацыялістычнай перабудовы нашай краіны. Індустрыялізацыя краіны, калектывізацыя вёскі і культурная рэвалюцыя—тры непарушныя часткі ленінскай лініі нашай партыі.

Нам патрэбны сотні тысяч новых арганізатараў сацыялістычнай гаспадаркі. Без рашучых мер па ўзьнаўленьні агульнакультурнага і палітычнага ўзроўню працоўных мы ня здолеем вырашыць задачы аб кадрах у тых тэмпах і разьмерах, якія дыктуюцца задачамі гаспадарчага будаўніцтва.

Апошнімі задамі ў галіне культурнага будаўніцтва мы маем значныя посьпехі. У гэтым годзе БССР першая з усіх рэспублік Саюзу ўступіла на шлях абавязковага Усеагульнага навучаньня і рашучай барацьбы з няпісьменнасьцю. Аднак, хутка тэмпы індустрыялізацыі краіны і ў сувязі з гэтым усё ўзрастаючая тэхніка вытворчасьці прад'яўляюць выключныя патрабаваньні да ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў, накіраваных да агульнага і тэхнічнага разьвіцьця, канкрэтныя палітычнага ўзроўню працоўных. Адсюль — асноўная задача сёньняшняга дня — барацьба за масавую культуру, за навуку, за кадры.

Зараз Нардамасьветы ўжо вызначаны прыкладныя контуры перабудовы культурнай пяцігодкі, а ўрадам зацьверджаны плян падрыхтоўкі кадраў. У гэтых планах мы ўжо не абмяжоўваемся ўвядзеньнем абавязковага навучаньня для першых двух год школьнага ўзросту, але ставім сабе больш шырокую задачу —абавязковае ўцягненьне ў наступным годзе ў школу ўсіх дзяцей ад 8 да 11 год. Апрача таго, мяркуецца ахоп да канца гэтай пяцігодкі ўсіх дзяцей рабочых і 25 проц. дзяцей калгасьнікаў 7-мігадовай асьветай. У працягу 1930-31 г. мы навучым грамаце ўсё працоўнае насельніцтва ва ўзросьце да 50 год у горадзе і да 40 год у вёсцы.

У раёнах суцэльнай калектывізацыі ўжо не абмяжоўваюцца абавязковым навучаньнем дзяцей пачынаючы з 8-мігадовага ўзросту. Там гэты ўзрост павышаецца да 10-4 нават 11 год.

Старая пяцігодка ў галіне народнае асьветы высоўвала ў сваёй аснове абавязковае навучаньне ў разьмеры 4-хгодкі ніжэйшай школы. Новыя планы накідваюць далёка ззаду гэтыя тэмпы, якія здаюцца зараз недапушчальна марудлівымі. У 1930-31 годзе ў гарадох і фабрычна-заводзкіх пасёлках мы прыступаем да ўвядзеньня абавязковага навучаньня ў абёме школы 7-мігодкі. Такім чынам, ідэя ўсеагульнай сярэдняй асьветы напярэдадні фактычнага ажыцьцяўленьня.

Вялізарная ўвага ў культурнай пяцігодцы зварачаецца на раёны суцэльнай калектывізацыі. 75 проц. усіх канчаючых педагагічныя ВНУ, тэхнікумы, павінны будуць пасылацца для пастаяннай работы ў раёны суцэльнай калектывізацыі. Да канца 1930-31 г. у калгасах сярод дарослага насельніцтва, паводле першага варыянту, не павінна быць ні аднаго няпісьменнага. Няпісьменнасьць сярод рэшты катэгорый насельніцтва будзе поўнасьцю ліквідавана ў 1932 годзе.

Асаблівая ўвага пяцігодкі зьвернута на разгортваньне сеткі школ фабрычна-заводзкага навучэньства, школ калгаснай моладзі. Ужо ў бягучым годзе на тэрыторыі Савецкага Саюзу ў раёнах суцэльнай калектывізацыі будзе створана ня менш 2.000 дзячных і 10.000 вячэрніх школ калгаснай моладзі. Прафшколы будуць будавацца з такім разьлікам, каб да канца пяцігодкі ахапіць імі асноўную масу вучняў сельскіх мясцовасьцей.

У гарадох разгорнецца сетка курсаў і рабочых унівэрсытэтаў, якія забясьпечаць у 1933 годзе навучаньне ня менш 40 проц. усяго індустрыяльнага пралетарыяту. Паводле праекту культурнай пяцігодкі, у кожным буйным калгасе, саўгасе, машына-трактарнай станцыі вырастуць калгасныя унівэрсытэты, разьлічаныя на дзесяткі тысяч вучняў.

Праз 4-6 год у раёнах калектывізацыі 50 проц. дашкольнай дзетвары будзе ахоплена рознымі выхаваўчымі ўстановамі.

Для выкананьня пляну культурнага будаўніцтва патрэбны вялізарныя сродкі. Ўзьнята пытаньне аб стварэньні 100-мільённага культурнага фонду вёскі, які будзе створаны з адлічэньняў ад спэцыяльных суботнікаў розных устаноў, тэатраў, кіно і інш. Бязумоўна, стварэньне такога фонду будзе аднэй з лепшых форм змычкі гораду і вёскі.

У праекце пяцігодкі значная ўвага зьвернута на радыёфікацыю Савецкага Саюзу. 14 мільёнаў радыё-прыемнікаў да канца пяцігодкі—вось рэальны вынік пляну радыёфікацыі.

Кіно, радыё, клюбы, шырокая сетка рабочых і калгасных унівэрсытэтаў дадуць вялізарны ўклад у культурнае будаўніцтва Савецкага Саюзу, у тым ліку Савецкай Беларусі.

Выкананьнем культурнай пяцігодкі, уцягненьнем мільённых мас рабочых і сялян у будаўніцтва культуры, «пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме», якую мы будуем ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы—мы выконваем адзін з асноўных заветаў Леніна.

Х. П.

За рашучую перабудову клюбнай работы

У агульнай сыстэме культурна-асьветнай работы адно з важнейшых месц займаюць клюбы.

Рост культурных запатрабаваньняў рабочае клясы, вялізарныя задачы сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі прад'яўляюць адказьнейшыя патрабаваньні клюбам.

Пераход прадпрыемстваў на бесьперапынку і на 7-дзённы рабочы дзень дае новыя магчымасьці разгортваньня гэтай работы.

У БССР на ўліку на 1-га кастрычніка 1929 году ёсьць 122 клюбы і наводзе нестак 1.044 ФЗМК — 1.317 чырвоных куткоў. Аб росьце іх уплыву сьведчаць наступныя лічбы. У рабоце 101 клюбу прымаюць акцыўны ўдзел 29.074 членаў, чырвонымі куткамі абслугоўваюцца 164.248 чал. Існуючымі 5.496 гурткамі ахоплена 82.728 чал. Чытаньне кніжак узрастае з кожным днём, напаўненьне бібліятэк бязупынна расьце. Клюб паступова становіцца сапраўдным ачагом культурнай рэвалюцыі, ахапляючы сваім уплывам усё новыя і новыя пласты рабочых. Клюбы будуць вялікую работу ў папулярызацыі пяцігодкі, сацыялістычнага спаборніцтва і мабілізацыі рабочых мас наўкола палітычных задач дня.

Клюб друкарэй зьяўляецца ўзорам перабудаванага клюбу. Ён правёў рад мерапрыемстваў у папулярызацыі сацыялістычнага спаборніцтва, у давядзеньні прамфінпляну да кожнага рабочага, наблізіў сваю работу непасрэдна да вытворчасьці. Клюб здолеў усю сваю работу прапясаць *баявымі палітычнымі* задачамі дня. Не пасьлабляючы ўвагі мабілізацыі рабочых на выкананьне прамфінпляну, клюб шырока растлумачвае задачы рабочае клясы ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у культурным будаўніцтве і г. д. Ва ўсёй рабоце клюбу прымае ўдзел клюбны актыў, культурноўпоўнаважаныя прадпрыемстваў.

У мэтах паладжаньня культурнага шефства над вёскай клюб арганізоўвае выезды мастацкіх гурткоў і прапагандысцкіх сіл у падшэфны раён. Тое-ж самае клюб арганізоўвае і ў падшэфнай райсковай часьці.

Аднак, нельга сказаць, што ўсе клюбы перабудавалі ўжо работу, што яны ідуць у ровень з тэмпамі гаспадарчага будаўніцтва.

Клюб мэталістых правёў усяго адзін вечар сацспаборніцтва, ніякай сыстэматычнай работы па растлумачэньні задач рабочых у галіне барацьбы за прамфінплян клюб не праводзіў. І гэта ў той час, калі на прадпрыемствы саюзу мэталістых прыпадае найбольшая колькасьць прарываў.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне ў клюбах паладжана невыстарчальна. Беларусізацыя клюбаў праходзіць надзвычай слаба. Большасьць клюбных гурткоў і масавых мерапрыемстваў праводзіцца на расійскай мове. Трохмесячнік пралетарскай культуры не выкарыстоўваецца клюбамі для мабілізацыі рабочых мас наўкола задач культурнага будаўніцтва.

Усесаюзная клюбная парада, якая зараз адбываецца, вырашыць рад важнейшых пытаньняў клюбнага будаўніцтва і зьявіцца пераломным этапам у клюбнай рабоце.

Клюбы павінны перабудаваць сваю работу, **стаць апорнымі пунктамі культурнай рэвалюцыі, павінны рашуча павярнуцца «тварам да вытворчасьці», перанесьці сваю работу на прадпрыемствы і ў цэхі, забясьпечыць клясавае інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых.**

Клюбы павінны зьвязаць сваю работу з сацыялістычным спаборніцтвам на прадпрыемстве, ударным рухам і важнейшымі агульна-палітычнымі задачамі дня.

Задача сыстэматычнай падрыхтоўкі культурных кадраў з рабочых набывае вялікае значэньне. Адначасова трэба больш уцягваць да практычнай работы клюбаў рабочых-ударнікаў, культуроўнаважаных цэхаў.

Усю сваю работу клюбы павінны праводзіць на аснове сацспаборніцтва, пасьпяваньня за тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Партарганізацыі павінны клюбнай рабоце аддаць значна больш увагі, чым да гэтага часу. Траба дапамагчы ім хутчэй перабудаваць сваю работу, каб стаць сапраўднымі штабамі культурнай рэвалюцыі, каб сапраўды павярнуцца тварам да вытворчых задач прадпрыемстваў.

Р. Д.

Клюб агітуе... кулакоў уступаць у калгасы

Менскі клюб імя Ільліча (таварная МББ чыг.) абсталёван вельмі добра. Ёсьць чытальня, зала, бібліятэка, асобныя пакоі для гульні ў шахматы. Усе пакоі завешаны партрэтамі, дыяграмамі, картаграмамі. Але гэта — знадворны выгляд. Зьмест клюбнай работы надзвычай дрэнны. Праўленьне клюбу за выключэньнем загадчыка клюбу і асобных адзінак ня цікавіцца работай. Вучкадрэфак ня цікавіцца прафсюзам і мясцкомы абмяжоўваюцца водпускам сродкаў. Партыйцы і камсамольцы ня толькі ня кіруюць работай, але нават не паведамляюць вузлавых рабочых сходаў і гэтым зрываюць важнейшыя палітычныя кампаніі. Так, былі па сутнасьці сарваны сходы, прысьвечаныя трохмесячніку беларускай пралетарскай культуры, заключэньню сацыялістычнага дагавору паміж клюбамі Ільліча і жлобінскіх чыгуначнікаў.

Як была праведзена антывалікодная кампанія чыгуначнікамі ў клюбе Ільліча? Сабралася каля 700 чал. Дарослых рабочых можна было пералічыць на пальцах. Клюб быў запоўнен адными вучнямі дзевяцігодкі. Адкрылі сход а 10 гадз. увечары. Дакладчыка ня слухалі, прыходзілася некалькі раз яго перапыняць і супакойваць публіку. Пасьля 10-хвілённага перапынку пачалася мастацкая частка. Была пастаўлена п'еса «Хрыстос уваскрос» (напісаная кіраўніком драмгуртка Нікіцiным) зусім палітычна нявытрымана. П'еса агітавала кулака, каб ён уступаў у калгас. П'еса не праглядалася ні Палітасьветам, ні Галоўпалітам. Праўленьне зрабіла вялікую памылку, што не прагледзела гэтай п'есы.

ЖЫДОВІЧ.

Па-бальшавіцку разгортваючы самакрытыку—хутка і рашуча выпраўляць памылкі

Пастанова бюро Менскага акруговому КП(б)Б аб скрыўленьні партлініі самахвалавіцкім РК КП(б)Б

1. Бюро АК прызнае, што Самахвалавіцкі райком КП(б)Б у рабоце па калектывізацыі бяднацка-серадняцкіх гаспадарак раёну і арганізацыі беднаты дапусьціў цэлы рад праваапартыстычных памылак і «левых» загібаў, якія выявіліся ў перагібах у справе калектывізацыі, раскулачваньні сераднякоў і ігнараваньні работы з батрацтвам, беднатой, а таксама ў перагібах па правядзеньні антырэлігійнай работы.

2. Бюро РК КП(б)Б, асабліва сакратар т. Астроўскі, замест мабілізацыі партыйнай арганізацыі і батрацка-бяднацка-серадняцкіх мас на рашучае ўпыраўленьне дапушчаных палітычных памылак і гаспадарчае замацаваньне калгасаў, да гэтага часу ніякіх мер на прыняла, а наадварот працягвала праваапартыстычную практыку, абараняючы варожыя элемэнты, якія, дзякуючы палітычнай блізарукасьці РК, сталі на чале калгасаў і сваімі дзеяньнямі дыскрэдытавалі калгасны рух, прыводзілі буйнейшыя калгасы да поўнага развалу.

3. Ня гледзячы на тое, што выпраўленьне дапушчаных памылак патрабавала ад бюро РК штодзённага жывога кіраўніцтва і непасрэднай сувязі з парт'ячэйкамі, бюро РК і асабліва сакратар РК тав. Астроўскі, замест узмацненьня жывога кіраўніцтва працай ячэек КП(б)Б, аказаньня ім дэпамогі ў выпраўленьні дапушчаных памылак, наладжваньня работы з беднатой і арганізацыі працы ў калгасах, — з раёну нікуды не выяжджаў, несваячасова інфармаваў АК аб хвараблівых зьявішчах у арганізацыі, гэтым самым усугубляў меўшыя месца памылкі.

4. Ігнаруючы работу сярод батракоў, бяднацка - серадняцкіх мас сялянства нацыянальных меншасьцей, асабліва палякоў, бюро РК паслабіла барацьбу з кулацтвам, чым аб'ектыўна спрыяла і дапамагала клясаваму ворагу ў яго рабоце, накіраванай супроць калгаснага будаўніцтва.

5. Замест правядзеньня шырокай растлумачальнай антырэлігійнай работы сярод батрацка - бяднацка - серадняцкіх мас сялянства, асабліва ў часе антывялікодная кампанії, асобныя члены РК (АПА) праводзілі злачынную работу, якая разыходзілася з лініяй партыі, на што бюро РК не рэагавала.

6. Ня гледзячы на сваячасовую і настойлівую сыгналізацыю аб усіх скажэньнях лініі партыі, газэта «Зьвязда» і брыгадзіра Ўральскай арганізацыі тав. Казьлёнка, РК і асабліва т. Астроўскі ня прынялі ніякіх мер да выпраўленьня дапушчаных памылак,—таму бюро АК пастанаўляе:

1) Бюро РК КП(б)Б і фракцыі РВК абвясьціць вымову.

2) Сакратара РК тав. Астроўскага за дапушчэньне і ўпартае няпрызнаньне памылак, устройства на савецкую і каапэрацыйную работу чужых элемэнтаў — зьняць з працы, забараніўшы яму на працягу 2-х год займаць адказныя выборныя партыйныя і савецкія пасады і абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем.

3) АПА РК т. Цікоўскага за грубае галавацяпскае парушэньне дырэктыў партыі ў галіне антырэлігійнай работы — зьняць з працы, забараніць займаць адказныя пасады на працягу аднаго году і абвясьціць вымову.

4) Арг. інструктарскаму аддзелу АК на працягу аднаго дня падабраць працаўнікоў у Самахвалавіцкі РК КП(б)Б, Члену бюро АК т. Цэнцыпару неадкладна выехаць для інфармацыі райпартарганізацыі аб пастанове бюро АК.

5. Гэтую пастанову абвясьціць у друку.

Кулаку на выгаду

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Факты, якія мелі месца ў Баранскім сельсавеце, Халопеніцкага раёну, могуць служыць узорам грубога скрыўленьня лініі партыі ў калгасным будаўніцтве. Гэтыя факты добра паказваюць, наколькі мясцовая парт'ячэйка, ігнаруючы дырэктывы партыі, злачынна скажала партыйную лінію і наколькі яна потым упарта не хацела выпраўляць сваіх памылак.

Калектывізацыя ў сельсавеце праводзілася мэтадам адміністраваньня і націску. Арсэналь мэтадаў і дзеяньняў баранскіх «калектывізатараў» быў даволі рознастайным. Мясцовыя камуністыя, у тым ліку і паасобныя раённыя работнікі, пры арганізацыі калгасаў карысталіся мэтадамі прышыбееўшчыны і галавацяпства. Былі выпадкі, калі сялянам, якія не хацелі ўступаць у калгасы, заяўлялася, што яны будуць выселены, ападатканы ў індывідуальным парадку, пазбаўлены права голасу і г. д. Раскулачваньне праведзена пры зусім слабым удзеле беднаты і серадняцтва. Баранскія камуністыя ігнаравалі самадзейнасьць і актыўнасьць бяднацка-серадняцкіх мас і ня лічылі патрэбным праводзіць патрэбнае работы сярод батрацтва і беднаты. Ці прыходзіцца пасьля гэтага дзівіцца, што зараз на тэрыторыі Баранскага сельсавету «суцэльнай» калектывізацыі зусім няма калгасаў.

Гэтыя факты праліваюць сьвятло на падзеі, якія адбыліся ў вёсках **Хрост і Пруды**, Баранскага сельсавету, і прымусілі мясцовых сялян паслаць сваіх дэлегатаў у рэдакцыю **«Зьвязды»**. У пачатку лютага ў сельсавеце скалочваецца першы калгас, у які былі аб'яднаны гэтыя вёскі. Адпаведнай папярэдняй работы сярод бяднацка-серадняцкіх мас ня было праведзена. Калгас быў арганізаваны адміністрацыйным парадкам. Сяляне, якія ня ведалі сутнасьці калектывізацыі, не атрымалі адпаведнага растлумачэньня, ішлі ў калгас з прычыны адсутнасьці іншага выхаду. Бяднацка-серадняцкі актыў застаўся па-за калгасам. Затое ў калгас уступіла найбольш заможная частка сераднякоў, каб уникнуць раскулачваньня, чым пагражалі ім мясцовыя работнікі.

Кіраўніцтва калгасам трапіла ў чужыя рукі. Шляхам націску старшынёю праўленьня калгасу быў «выбраны» партыец **Кульгавы**. Ён яшчэ пры чысьцы выключаўся з партыі за п'янства. У склад праўленьня таксама прайшоў кулак, потым высланы з БССР.

Кульгавы, замест кіраўніцтва калгасам, дапусьціў агідныя папойкі, якія арганізовывалі мясцовыя работнікі ў часе раскулачваньня. Пры гэтым канфіскаваная ў кулакоў маемасьць раскрадвалася. Лёгічным вынікам усіх гэтых злачынстваў зьявіўся развал калгасу.

Пасьля развалу калгасу партыйная ячэйка пальцам не паварушыла, каб выправіць дапушчаныя злачынныя скажэньні. Наадварот, мясцовыя прышыбеевы, каб выратаваць становішча, пачалі зварачацца зноў да пагроз і запалохваньня. Калі-ж пагрозы не дапамагалі, дык знайшлі просты выхад.

— Ня хочаце ісьці ў калгас — ця трэба, абыйдземся і бяз вас, самі створым камуну.

Такім чынам, замест хуткага і рашучага выпраўленьня сваіх грубейшых памылак, баранская ячэйка з благаслаўленьня райкому пачала прыступіць да арганізацыі камуны. Развалўшы калгас, дыскрэдытуючы ідэю калектывізацыі, мясцовыя прышыбеевы пачалі стварэць «паказальную камуну». Для пачатку ў камуну прымусілі ўступіць усіх камсамольцаў, што жылі на тэрыторыі сельсавету. Тых, што адмовіліся ўступіць у калгасы, выключалі з камсамолу. Потым у камуну быў адкрыты шырокі прыём. У камуну пралезьлі чужыя, выпадковыя элемэнты. Пёны падобнае работы хутка выявіліся. Безгаспадарчасьць, спажывецкія настроі, засьмечанасьць складу камуны, адсутнасьць кіраўніцтва зрывалі работу камуны. Зрабілася відавочнай уся бездапаможнасьць і шкодная спробы пераскочыць праз арцель да камуны. Так працавалі баранскія «калектывізатары»... кулаку на выгаду і на шкоду калектывізацыі. Сяляне вёсак **Хрост і Пруды**, зразумела, былі настроены супроць камуны. Гэта яшчэ больш паглыбляла тым, што кіраўнікі сельсавету парашылі адрэзаць для камуны вучастак ад зямель, якія належалі сялянам вёсак Хрост і Пруды. У камуну ўвайшла толькі незначная група прудаўскіх сялян, якая спалохалася пагроз.

Усю гэту прышыбееўшчыну, нарэшце, стала зусім немагчыма цярпець. Разьвязка наступіла тады, калі камунары прыехалі араць на зямлю сялян вёсак Хрост і Пруды. Членаў камуны сустрэлі з каламі...

Аб гэтых падзеях было паведамлена раённаму камітэту партыі. Райком, абмежаваўся пасылкай у Баранскі сельсавет нам. нач. раймілыцыі **Данільчыка** і аднаго міліцыянэра. Гэтыя работнікі «бліскуча» выраплілі справу. Пад іх кіраўніцтвам у сельсавеце былі дапушчаны новыя злачынныя абураючыя скажэньні — пад абаронай міліцыянэраў камунары пасьпелі араць зямлю хрустаўскіх беднякоў і сераднякоў.

Замест самай шырокай растлумачальнай работы, замест неадкладнага прыцягненьня да суровай адказнасьці баранскіх прышыбеевых, у сельсавеце былі яшчэ больш паглыблены самыя грубыя памылкі і скрыўленьні. Бессансоўныя арышты, пагрозы і запалохваньні — такімі мэтаамі прадстаўнікі раёну вырашылі канфлікт паміж камунай і вёскамі Хрост і Пруды.

***

Зараз бюро РК ухваліла пастанову па баранскай справе. Бюро прызнала адбор зямлі ў хрустаўскіх сялян **няправільным і вярнула** ім яе. Камуна пераведзена на статут с.-г. арцелі. У камуне праведзена **адкрытая чыстка.** Зроблены рад арганізацыйных вываляў. Кульгавы **выключаны** з партыі. Па справе аб раскрадваньні канфіскаванай кулацкай маемасьці вядзецца сьледзтва. Хутка адбудзецца паказальны суд. Сакратару парт'ячэйкі абвешчана вымова. Распачата сьледзтва на абвінавачаньні яго ў сувязі з варожым элемэнтам. Пачата судовае сьледзтва на абвінавачаньні Данільчыка ў недапушчальна грубых адносінах да хрустаўскіх і прудаўскіх сялян. Бюро РК ЛКСМВ распусьціла бюро камсамольскай ячэйкі камуны.

Са заданьнем адзначаючы гэтыя меры, мы тым больш ня можам прайсьці міма тае назыцыі, якую заняло бюро Халопеніцкага райкому ў адносінах да самога сябе. Зусім відавочна, што Халопеніцкі РК нясе поўную адказнасьць за злачыннае скажэньне партыйнай лініі і перагібы, якія мелі месца ў Баранскім сельсавеце

На вачох райкому рабіліся ўсе гэтыя агідныя справы. Бюро РК санкцыянавала арганізацыю камуны. **Віна Халопеніцкага РК тым больш узрастае, што да прыезду прадстаўніка «Зьвязды», бюро РК не прыняло ніякіх пастаноў па баранскай справе і нічога не зрабіла, каб спыніць скажэньні і перагібы, якія рабіліся ў гэтым сельсавеце.**

У сьвятле гэтых фактаў зусім незразумелым становіцца тое, чаму бюро Халопеніцкага РК у сваёй пастанове нічога не сказала аб сваіх палітычных памылках, дапушчаных у гэтай справе. Напэўна, кіраўнікі Халопеніцкай арганізацыі ня любяць самакрытыкі. Такая палавіннасьць у прызнаньні памылак—недапушчальна.

Спыненьне перагібаў і грубых скрыўленьняў партыйнай лініі, якія мелі месца ў Баранскім сельсавеце, дае ўжо свае выпікі. Частка прудаўскіх сялян, якія выйшлі з камуны, зараз вярнулася ў калгас.

Б. ПАПОЎ.

Халопеничы, Менгшчына.

Мар'інагорскія душыцелі самакрытыкі

Што пастанавіла ЦБ Пралетстуду па справе аб самагубстве студэнткі Касаковіч

12-га красавіка ў «Зьвязьдзе» быў надрукаваны допіс аб самагубстве студэнткі Мар'іна-Горскага садова-гароднага тэхнікуму т. **Касаковіч.**

Наўкола студэнткі **Касаковіч** была складзена надзвычай нездаровая атмасфэра. Яе цкавалі за рашучыя выступленьні з крытыкай работы грамадзкіх арганізацый тэхнікуму, работы асобных працаўнікоў. Студэнтка **Касаковіч** аб усіх недахопах у рабоце тэхнікуму пісала ў насьценгазэце. Гэта не спадабалася некаторым студэнтам, работнікам тэхнікуму. Справа цкаваньня дайшла да таго, што ў ложак **Касаковіч** надкладалі розныя рэчы (ножык, панчохі і інш.), а потым рабілі вобыск, абвінавачвалі яе ў пакражы гэтых рэчаў.

Сход камсамольскай ячэйкі выключыў **Касаковіч** з камсамолу за пакражу, прафком выключыў з членаў саюзу і хадайнічаў аб выключэньні яе з тэхнікуму. **Усё гэта было зроблена ў тры дні.** У выніку гэтага — студэнтка даведзеная до роспачы пакончыла жыцьцё самагубствам.

ЦБ Пралетстуду вылучыла спэцыяльную камісію для расьсьледваньня гэтага факту. У сваёй рэзалюцыі па дакладу камісіі ЦБ Пралетстуду адзначыла, што прафком мар'іна-горскага тэхнікуму зусім не рэагаваў на заяву **Касаковіч** аб тым, што яе цкуюць, ня прыняў крокаў да абароны студкора і пасьля самагубства імкнуўся замазаць гэтую справу.

ЦБ Пралетстуду, адзначыў тое, што прафком не справіўся з асноўнымі задачамі ў падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў, а таксама дапамагаў заціску самакрытыкі—ухваліла распусьціць прафком мар'іна-горскага садова-агароднага тэхнікуму. Таксама ўзьнята пытаньне перад Наркамасьветы аб зьняцьці з работы дырэктара тэхнікуму **Глушаноўсага**, аб прыцягненьні да адказнасьці інспэктара Наркамасьветы т. **Лазарэнка**, які сваячасова быў інфармаваны аб самагубстве Касаковіч, але ня прыняў крокаў да расьсьледваньня прычын гэтага самагубства, ЦБ Пралетстуду, выходзячы з таго, што рэдкалегія насьценгазэты тэхнікуму не змагла стаць на чале разгортваньня самакрытыкі, не прыняла рашучых мер да абароны студкора — ухваліла пераабрацць рэдкалегію.

ЦБ Пралетстуду запрапанавала ўсім студэнцкім прафарганізацыям БССР абгаварыць здарэньне, якое адбылося ў мар'іна-горскім тэхнікуме на сходах студэнцтва, завастрыць ўвагу студэнцтва на разгортваньне самай рашучай бальшавіцкай самакрытыкі.

Р.

Супроць буржуазнай рэакцыі ў мовазнаўстве*)

(Аб лінгвістычнай дыскусіі ў Беларускай Акадэміі Навук)

У папярэднім артыкуле мы бачылі, якім чынам вялікадзяржаўны шавінізм імкнецца надаць сваім выступленьням «левы» бляск, «левую» мішуру.

Беларускі нацыянал-дэмакратызм у гэтых адносінах выключэньнем не зьяўляецца.

Трук беларускага нацыянал-дэмакратызму заключаецца ў наступным: да беларускай культуры, да беларускай мовы трэба мець асобны падыход, бо яна, як такая, не існуе, і далкам зьяўляецца культурай прынечаных, экспляатаваных. У адносінах беларускай культуры пэльга ставіць пытаньне дыферэнцыявана, бо ў даным выпадку **нацыянальная культура цалкам супадае з клясавай**, з культурай **аднэй** клясы.

Нацыянал-дэмакрат надобнага толку вялікадушна дазволіць шукаць **дзьве** культуры ў культуры кожнай нацыі. Ён робіць толькі «маленькую» агаворку, што да беларускай культуры гэта не адносіцца. «Наогул» Ленін мае рацыю, але да беларускай рэчаіснасьці налажэньняў ленінізму нельга дастасоўваць, бо беларуская культура мае сваёй крыніцай і творцам выключна і толькі прыгнечаныя клясы.

Гэта тэорыя «ўгрунтоўваецца» наступным чынам: чыкоўнік набеларуску не гаварыў. Яго мова была расійская мова. Ганьляр, купец гаварыў паляўрэйску, паменчык і кулак гаварылі папольску, а на беларускай мове гаварыла толькі прыгнечаное сялянства. Беларуская мова была заўсёды сьцягам прыгнечаных, яусны экспляататараў, буржуазіі не апаганьвалі яе.

Перш за ўсё адсюль вынікае, што беларускай буржуазіі ня было ніколі. Прыгнечаныя і экспляататары могуць належаць да любой нацыі, але ва ўсякім выпадку не да беларускай. Беларускага экспляататара і з агнём ня знойдзеш.

Адсюль вынікае яшчэ і тое цьверджаньне, што ўся беларуская інтэлігенцыя, якая зьвязана з беларускай культурай, зьяўляецца выключна рэвалюцыйнай, пралетарскай. Тая адна акалічнасьць, што яны працуюць на ніве беларускай культуры, гэты факт сам на сабе зьяўляецца выстарчальнай гарантыяй іх рэвалюцыйнасьці. Але ў такім выпадку становіцца бессансоўнай сама пастаноўка пытаньня аб беларускім нацыянал-дэмакратызьме, аб рэакцыйных і контр-рэвалюцыйных плянах у беларускай літаратуры, навуцы і г. д. Усе-ж гэтыя аб'екты і суб'екты гаворыць, шыпуць, «творацьь» на беларускай мове, значыцца, яны ўжо забясьпечаны імунітэтам супроць усякіх кепскіх хваробаў, ніякі «лукавы» ня здолее іх спакусіць.

І, нарэшце, адсюль вынікае бязумоўны рэвалюцыйны характар **усіх** існаваўшых беларускіх арганізацый і партый. Прадстаўнікі буржуазіі не маглі-б пісаць пабеларуску, бо беларуская мова арганічна ня вяжацца з буржуазнасьцю. Такім чынам, «Наша Ніва» бязумоўна зьяўляецца рэвалюцыйнай арганізацыяй...

У дыскусіі па дакладу т. Вальфсона падобную пазыцыю заядла абараняў ак. Ластоўскі. Прычым, у довад рэвалюцыйнасьці «Нашай Нівы» ён падаў вельмі «пераканаўчы» і «важкі» довад, а імення, што ён сам зьяўляўся членам гэтай арганізацыі. І сапраўды, ці можна сумневацца ў бездакорнасьці, рэвалюцыйнай вытрыманасьці і пралетарскай стойкасьці «Нашай Нівы», калі «сам» Ластоўскі знаходзіўся ў ёй?..

Ідэя гэта далёка не зьяўляецца манаполіяй беларускага нацыянал-дэмакратызму. Як аўтар гэтых радкоў паказаў (у сваім дакладзе «Клясавае змаганьне ў ўрэйскай лінгвістыцы») яна ня менш уласьціва і ўрэйскаму нацыянал-дэмакратызму ў лінгвістыцы—ідэалёгіі «ідышызму». «Ідысты» таксама сьцьвярджаюць, што «ідыш» зьяўляецца мовай выключна «народных мас», народных нізоў. Арытмэтыка такая-ж, як і ў беларускага нацыянал-дэмакратызму: «вышэйшыя клясы» на ўрэйскай мове не гаварылі і ня пісалі. Іх мовай была або расійская, або польская, або нямецкая, або старажытна-ўрэйская, ва ўсякім выпадку ня «ідыш». «Ідыш»—гэта мова служкаў, мова рамесьнікаў, адным словам, працоўнага люду, «дэмосу».

Мы хочам завастрыць тут увагу на тым мамэнце, што ўрэйская культура, ўрэйская мова (ідыш) і культура прыгнечаных кляс, пралетарская культура адназначнае паняцьце. Гэты довад быў у свой час улюбёным аргумантам «бунду», калі ён стараўся за нацыянальна-культурную аўтаномію і хацеў перакопваць ўрэйскіх рабочых быццам яны заняпадуна (1923 г.) адзін з стаўпоў «ідышызму», Н. Штыф, пісаў:

«Сьмешна, калі нам прад'яўляюць патрабаваньне ў пралетарскай культуры. Ўрэйская культура сама па сабе зьяўляецца найбольш пралетарскай. І такавою яна зьяўляецца ў сілу таго, што ўрэйская мова, «ідыш»—пралетарская мова».

У беларускага нацыянал-дэмакрата вынікае адсюль ідэалізацыя «Грамады», «Нашай Нівы», у ўрэйскага—ідэалізацыя «Бунду», П. Ц. і г. д.

Відавочна, нацыянал-дэмакраты розных нацыянальнасьцяй ня толькі выдуць у адзін і той-жа самы Рым, але і дарогі туды вельмі часта ў іх адналікавыя: тыя-ж довады.

А зараз пяройдзем яшчэ да аднэй праблемы—роля пралетарыяту ў стварэньні літаратурнае беларускае мовы. Нацыянальнае пытаньне ёсьць пытаньне ўзаемавачосін пралетарыяту і сялянства. Пралетарыят зьяўляецца гегемонам, значыцца, ён павінен ведаць мову тых мас, якімі ён кіруе, ён павінен уладаць гэтым «інструмантам» кіраўніцтва.

Адсюль праф. Бузук робіў той вывад, што роля пралетарыяту ў галіне беларускае мовы заключаецца выключна ў тым, каб **вывучыць** беларускую мову. А настаўнікам пралетарыяту ў гэтым сэнсе зьяўляецца сялянства. Пралетарыяту дазволена быць кіраўніком дзе хочаш, але ў гэтай галіне ён толькі **вучань.** Ён пасьўна ўспрымае гэту мову, але ня **творыць** яе. Творца мовы — сялянства. Прычым, нейкім чынам праф. Бузук умудрыўся ў гэтым уледзець сутнасьць «змычкі».

Гэта мысьль **няправільная палітычна.** Няма абсалютна тэй галіны сацыяльнага жыцьця, дзе-б не выяўлялася раней ці пазьней кіраўнічая роля пралетарыяту. Некаторыя «наверхі» пралетарыят захватвае зараз-жа, займаючы там камандныя вышыні. На некаторых паверхах, асабліва культуры, пралетарыяту прыходзіцца весьці больш працяжнае змаганьне за камандныя вышыні. Але скрозь і ўсюды, на ўсіх вучастках у канчатковым падрахунку культура панучай клясы становіцца панучай культурай.

Нельга ізаляваць форму ад зьместу. Нельга прадставіць сабе справу так, быццам пралетарыят «назычае» гатовенькую форму і «ўлівае» ў яе свой зьмест.

Форма сама па сабе таксама не зьяўляецца клясава-нэйтральнай. Яна таксама абарбавана ў поўным клясавым тоны. Пралетарскі зьмест культуры поўным чынам відазьмяняе самую нацыянальную форму (у прыватнасьці і мову), узбагачаючы і разьвіваючы яе.

Гэтае палажэньне няправільнае і **фактычна.** Адсюль вынікае, быццам пралетарыят БССР не зьяўляецца беларускім па нацыянальнасьці. Між тым, пераважная большасьць пралетарыяту БССР — беларусы па нацыянальнасьці. Праф. Бузук ня ўлічыў таго грандыёзнага працэсу ўцягненьня новых вялікіх рэзэрваў у прамысловасьць. Праф. Бузук забыў аб тэмпах нашага сацыялістычнага будаўніцтва, ён выпусьціў з-пад увагі пяцігодку.

Нарэшце, яно і няправільна з пункту погляду лінгвістычнае навукі. У працэсе стварэньня мовы, а гэты працэс ніколі не прыпыняецца, няма такога падзелу, што адзін карыстаецца мовай, «ужывае» яе, а другі—зьяўляецца творцай, выбраліе яе.

За гэты тэзіс праф. Бузука ўхапіліся Лёсік і яго нацыянал-дэмакратычная кампанія. Такую кобтку варта пасмакташь. Лёсік на гэту здабычу і накінуўся.

У гэтай дыскусіі выявілася, між іншым, тая «ўстаноначка». нацыянал-дэмакратаў, аб якой мы ўжо гаварылі вышэй: у БССР беларускага пралетарыяту няма, вёска—беларуская, горад—ўрэйскі. Значыцца, гарадзкі пралетарыят ня можа прэтэндаваць на кіраўніцтво ролю ў працэсе разьвіцьця беларускае мовы. Гэта роля належыць сялянству.

І дзіўная справа, як зноў скрыжоўваюцца шляхі беларускага і ўрэйскага нацыянал-дэмакратызму. Ўрэйск

Ліквідаваць прарывы ў арганізацыі палявых работ

Правільная арганізацыя працы ў калгасах — залог пасьпяховага правядзеньня сяўбы і замацаваньня калектыўнага руху

БЕЗ КІРАЎНІЦТВА І ПЛЯНУ

Аб перагібах у Лельчыцкім раёне, Мазырскай акругі, у свой час пісалася даволі многа. Кіраўніцтва раёнам шляхам нацiску і адміністрацыйных мер думала ажыцьцявіць суцэльную калектывізацыю. За самы кароткі тэрмін лельчыцкія працаўнікі дабіліся 70-процантнай напаровай калектывізацыі раёну. Яны далёка апярэдзілі масы і страцілі з ёю сувязь. Забыліся аб арганізацыі батрацка-бядняцкіх мас і замацаваньні саюзу з серадняком.

Вынікі гэтага галавакружэньня ад посьпехаў вядомыя: у раёне засталося 19 калгасаў з 536 гаспадаркамі, на плошчы 4.200 гэкт. (усяго ў раёне 5.000 гаспадарак).

Партыйна-савецкае кіраўніцтва Лельчыцкага раёну, якое дапусьціла грубейшыя скажэньні і перагібы, распушчана, але нават зараз яшчэ ня скончана канструяваньне раённага камітэту партыі. Яшчэ няма новага сакратара райкому. Мазырскі акругком КП(б)Б непадпушчальна зацягваў са заменаю кіраўніцтва. Гэта ў сваю чаргу замаруджала выпраўленьне перагібаў і памылак.

Ва ўсіх вёсках, дзе мы былі скардзіліся на адсутнасьць раённага кіраўніцтва, што вельмі адбілася на працы па замацаваньні калгасаў і на падрыхтоўцы іх да арганізаванага выхаду ў поле.

Адсутнасьць кіраўніцтва адбілася вельмі моцна на арганізацыі сяўбы індывідуальнікамі. На 15 красавіка індывідуальнікам была адведзена зямля толькі ў 7 вёсках з 19, на тэрыторыі якіх ёсьць калгасы. Гэта адыгрывае пачатак сяўбы на індывідуальным сэктары. Зацяжка выкарыстоўваецца кулакам, які падбухторвае сялян ня сеяць на новых землях, ня браць іх, а натрабляваць зварсту ранейшых вучасткаў.

У радзе сельсаветаў на разгортваньні сяўбы ў індывідуальным сэктары адбіваецца яшчэ тая акалічнасьць, што мінулае кіраўніцтва дапусьціла парушэньне дырэктыў партыі пры правядзеньні хлебазагатовак. У Лельчыцкім раёне плян хлебазагатовак даводзілі і да сердняка. І калі ён ня выканаў поўнасьцю пляну, дык затрымліваюць яму выдачу насеньня, якое было, між іншым, няправільна абагулена. Частка насеньня ўтрымліваецца ў залік таго хлеба, які ня быў здадзены паводле пляну. Толькі зараз новы старшыня РВК даў загад спыніць гэтыя незаконныя дзеяньні. Растлумачэньне ільгот па с.-г. падатку індывідуальнікам праводзіцца вельмі дрэнна. Мы мыталі некалькі дзесяткаў сялян у вёсках і выявілі, што ніхто з іх аб ільготах ня ведае.

У в. Буйнавічах выявіліся своеасаблівыя мэтады давядзеньня пляну пашырэньня яравога кліну да асобнага двара. Мясцовыя сельсаветчыкі выклікаюць сялян у сельсавет, падлічваюць плошчу іх зямлі на акладных лістох і мэханічна дабаўляюць 19 проц. на пашырэньне пасеўнай плошчы. Кожны селянін павінен даць распіску, што ён гэты загад сельсавету выканае. Мы маем тут фактычна стары мэтад ажыцьцяўленьня масавых мерапрыемстваў шляхам адміністрацыйнага нацiску, а не разгортваньнем сапраўды масавай растлумачальнай працы сярод беднякоў і сераднякоў.

Як-жа ідзе сяўба ў Лельчыцкім раёне і якія тут перашкоды?

Трэба прызнаць, што палявыя работы ў радзе калгасаў раёну ўсё яшчэ праходзяць бесплянава, бо няма належнага нагляду і кіраўніцтва з боку раённых арганізацый. Кожны калгас робіць так, як яму ўздумаецца. Напрыклад, калгас в. Мілашэвічы міркуе засеяць 200 пудоў аўсу і ўсім на сеяць культурных траў.

Асноўная прычына дрэннага разгортваньня палявых работ у радзе калгасаў заключаецца ў тым, што **праца калгасаў не арганізавана, і што ня вызначана форма аплаты працы.** У некаторых калгасах існуе падзенная аплата, а ў іншых — зусім няма распэнак. Калгаснік ня ведае, што ён будзе атрымліваць у калгасе. Горш за ўсё тое, што і праўленьні калгасаў пакуль што яшчэ не вырашаюць гэтага пытаньня.

Нічога дзіўнога, што пры такой бяссыстэмнасьці прадукцыйнасьць працы ў калгасах вельмі нізкая. Кулаччо скарыстоўвае гэты момант для пашырэньня розных чутак і плёткак пра калгасы.

Трэба некалькі спыніцца на так званых выдзяленцах. Выдзяленцтва перашкаджае замацаваньню калгасаў. Выдзяленцам лічыцца той (глава сям'і, або член яе), які ўваходзіць у калгас, а яго ўся сям'я застаецца на індывідуальнай гаспадарцы. Выдзяленец прыходзіць у калгас з голымі рукамі.

Возьмем некалькі прыкладаў.

У калгасе в. Мілашэвічы налічваецца 5 бяднякоў і 7 батракоў. Старшыня, Мілашэвіцкага сельсавету таксама зьяўляецца выдзяленцам у калгасе, які нічога ня здаў у калгас (ён, між іншым, кандыдат партыі).

У калгас в. Стадолічы ўваходзяць 13 двароў і 20 адзіночак, сярод якіх 9 выдзяленцаў.

Выдзяленцтва вельмі дрэнна адбіваецца на настроях сераднякоў, якія ўсёй сям'ёй увайшлі ў калгасы і здалі туды свае сродкі вытворчасьці.

Трэба востра ставіць пытаньне перад выдзяленцамі, каб у калгас была перададзена з яго двара тая частка маемасьці, якая прыпадае на яго.

Між тым, мясцовыя работнікі ня ўдзяляюць належнай увагі вырашэньню гэтага пытаньня.

Брыгадзіры «Зьвязды» Л. і Х.

Самацёк—замест арганізацыі працы

„Як зробяць, так і будзе добра"

Пад бокам прапойскіх раённых устаноў знаходзіцца самы буйны і моцны мястэчкавы калгас «Кастрычнік», які яднае 175 гаспадарак беларускага і яўрэйскага працоўнага насельніцтва. Калгас мае ўсе пэрспэктывы для далейшага эканамічнага замацаваньня і росту. На тэрыторыі калгасу ёсьць 40 гэктараў фруктовага саду, паравы млын на дзьве паставы, 62 каровы, шмат маладняка. Цягавай сілай калгасы зусім забясьпечаны. У калгасе ёсьць 136 рабочых коняй.

На 22-га красавіка калгасам заарана 30 гэкт. пад яравыя культуры. Зараз калгас прыступіў да сяўбы. Пры першым-жа выезьдзе ў поле ў калгас уступіла 40 новых гаспадароў.

Але, ня гледзячы на ўсе гэтыя добрыя пэрспэктывы для далейшага разьвіцьця калгасаў, у ім дагэтуль як след не наладжана арганізацыя працы. Гэта выявілася ў першыя-ж дні палявых работ. Калгас разьбіт на 5 аддзяленьняў. І вось, калі Слабодзкае аддзяленьне, маючы 8 коняй, заарала 75 гэкт., неравысіўшы нормы выпрацоўкі, то ў гэты самы час цэнтральнае аддзяленьне недавыканала нормы. Тлумачыцца гэта тым, што працоўная дысцыпліна знаходзіцца на вельмі нізкай ступені. Працуюць, як кажуць, з халадком. Ёсьць нават прагульшчыкі, некаторыя калгасьнікі выяжджаюць на работу а 10-й гадзіне, а праз 3 гадзіны ўжо вароча́юцца дадому. У калгасе няма ўліку праробленай работы і яе якасьці. Фактычна ў калгасе існуе падзённічына. Усё гэта адбіваецца на прадукцыйнасьці працы.

Ні праўленьне калгасу, ні агра-тэхнічны пэрсанал райкалгассаюзу не падумалі аб рацыяналізацыі палявых работ. У часе выязкі гною выявілася, што фурманка стаіць каля хлява на 20-30 мінут у чарзе. Між тым, гэты «дробязны» недахоп зусім лёгка можна было зьнішчыць, павялічыўшы колькасьць рабочых па нагрузцы гною на фурманкі. Такіх «дробязных» недахопаў вельмі шмат ня толькі ў калгасе «Кастрычнік», але і ў іншых.

Праўленьне калгасу «Кастрычнік» нават яшчэ не распрацавала правіл унутранага распарадку, ня ўлічыла рабочую сілу, не разьмеркавала яе, як след. Некаторыя калгасьнікі замест выезду на калектыўнае поле, працуюць па сваіх уласных сядзібах. Трэба для работы на ўласных сядзібных землях вызначыць спэцыяльныя дні і гадзіны, каб гэта не перашкаджала рабоце па засеву калгаснага поля.

Праўленьне калгасу зусім ня склікае вытворчых нарад, між тым, вельмі карысна было склікаць іх штотыдня, каб па-хаду выпраўляць заўважаныя хібы. Дрэнна і тое, што дагэтуль не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва памж брыгадамі. Праўленьне нават аб гэтым не падумала.

Райкалгассаюз, які знаходзіцца тут-жа над бокам, фактычна ня кіруе работай калгасаў і спадзяецца на самацёк — «як зробяць, так і будзе добра».

У калгас «Кастрычнік» пралезьлі варожыя элемэнты, якія імкнуцца падарваць работу калгасу. Замест работы на полі, яны зьбіраюць вакол сябе аратых і пачынаюць разважаць, што, моў, «яўрэі ня ўмеюць добра працаваць, навошта нам служачыя ў калгасе і г. д.». На практыцы мы бачым адваротнае. Яўрэйскае насельніцтва працуе па палёх вельмі добра.

У калгасе не вядзецца амаль ніякай культурна - выхаваўчай работы. Неабходна, каб партыйцы і камсамольцы, якія сядуць на поле, у часе абедзенага перапынку знаёмілі калгасьнікаў з апошнімі дырэктывамі ўраду і партыі, чыталі ім газэты і разгарнулі-б культурную работу ў калгасе.

Брыгадзір «Зьвязды» В. ВОІНАЎ.

Будаўніцтва патрабуе ўдарных тэмпаў

Поўнасьцю выканаць праграму капітальнага будаўніцтва

Вытворчая праграма будаўнічага аб'яднаньня ВСНГБ сёлета значна пашырана і складае 34 мільёны руб. Вялікая праграма будаўніцтва патрабуе асобных тэмпаў і добрай падрыхтоўкі да сэзону. Будаўнічае аб'яднаньне ВСНГБ ня здолела прыстасаваць сваёй работы да вялікіх тэмпаў будаўніцтва.

З прычыны надзвычай цёплай пагоды, будаўнічы сэзон сёлета разгарнуўся значна раней, чым у мінулыя гады. Ужо зараз на работах будаўканьня працуе 7.500 рабочых, замест 1.700, якія працавалі ў мінулым годзе.

Між тым, падрыхтоўка да будаўніцтва праведзена слаба амаль па ўсіх аддзелах БССР. Лепш за ўсіх падрыхтавалася Віцебшчына.

Разгортваньню будаўніцтва перашкаджае злачынна дрэнная падрыхтоўка праектаў, недахват рабочай сілы як кваліфікаванай, так і чорнарабочай і вельмі цяжкое становішча з будаўнічымі матар'яламі.

Рад буйных аб'ектаў будаўніцтва дагэтуль яшчэ ня маюць праектаў. У Менскім аддзяленьні Белдзяржбуду няма ні аднаго праекту на аб'екты новага будаўніцтва, ня складзены праекты на такія буйныя пабудовы, як футравая фабрыка ў Менску, абутковая фабрыка, ільна - прадзільны камбінат у Воршы і г. д.

Не хапае цесьляроў, каменшчыкаў і нават некваліфікаваных чорнарабочых. З-за галавацяпства мясцовых арганізацый 6.000 высока кваліфікаваных каменшчыкаў і тынкоўшчыкаў выехалі на працу з Гомельшчыны за межы БССР.

Заяўкі на будаўнічыя матар'ялы ў гэтым годзе значна ўрэзаны. Па некаторых матар'ялах гэта ўрэзка складае 50 і больш процантаў. Вялікі недахват адчуваецца таксама і ў цэгле, якой не хапае для выкананьня будаўнічай праграмы каля 22 мільёнаў штук. Сёлета будуецца 10 новых цагелень, якія могуць даць прадукцыю у 60 мільёнаў штук цэглы ў год, але ў гэтым годзе новыя заводы выпусьцяць толькі 6-8 мільёнаў шт. цэглы.

Трэба адзначыць, што нашы будаўнічыя арганізацыі мала клапаціліся аб вырабе будаўнічых матар'ялаў, якія могуць замяніць дэфіцытныя матар'ялы; нават камень і граві ў некаторых мясцох прыдзецца завозіць з-за межаў БССР.

Дагэтуль ня вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па зьніжэньні сабекошту будаўніцтва. Дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту на 14 проц. напэўна ня будзе выканана.

Мала што зроблена ў адносінах культурна - бытавога абслугоўваньня сэзоньнікаў і паляпшэньня аховы працы на пабудовах.

Трэба ў тэрміновым парадку зьнішчыць гэтыя недахопы, якія перашкаджаюць выкананьню пляну капітальнага будаўніцтва гэтага году.

А. З.

Хто затрымлівае пабудову швэйнай фабрыкі ў Магілеве

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Магілеўскі акрыпаг зрывае будаўніцтва новай швэйнай фабрыкі ў Магілеве. Як вядома, вышэйшыя органы пастанавілі пабудаваць у Магілеве новую швэйную фабрыку на 11.000 рабочых. Спэцыяльная камісія Белшвейпрам'яднаньня на працягу тыдня працавала ў Магілеве і распрацавала плян пабудовы. Акрыпан абяцаў да 10-га красавіка прыслаць усе матар'ялы на абсьледаваньні месца пабудовы. Да 25-га красавіка матар'ялы не паступілі.

Напярэдадні гадавіны сацспаборніцтва

Самаправеркай узмоцнім сацспаборніцтва

Рашуча выяўляючы вытворчыя недахопы, бязьлітасна выкрываючы інжэнэрнікаў, мабілізуем яшчэ большыя масы на барацьбу за прамфінплян

БЕЗ КІРАЎНІЦТВА

Злачынныя адносіны арганізацый Аршанскага вузла да сацспаборніцтва

Прафарганізацыя аказалася няздольнай арганізаваць энтузіязм рабочых мас.—Вызваліць чыгуначныя арганізацыі ад гультаёў

Сацспаборніцтва на Аршанскім вучастку аддзелу цягі МБВ чыг. пачалося ў чэрвені—ліпені мінулага году. На 1-га сакавіка 1930 году было 18 ударных брыгад, якія ахапілі 342 чал., з іх 31 партыец і 18 камсамольцаў. На гэты-ж тэрмін было заключана 11 сацдагавораў.

Ня гледзячы на тое, што былі створаны ўдарныя брыгады, заключаны сацдагаворы і вучастак быў абвешчаны ўдарным, кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам адсутнічала.

Спаборніцтва і ўдарніцтва праходзілі стыхійна, неарганізавана, без патрэбнага ўліку. Пры заключэньні дагавораў аб'екты спаборніцтва не даволі прапрацоўваліся, таму дагаворы, у большасьці сваёй, шаблённыя, ня ўлічваюць мясцовых умоў, што ў выніку дало рад дагаворaў на паперы. Рабочыя бадай ня ведалі пра зьмест заключаных дагавораў, а калі хто і ведаў, дык не разумеў, што ад яго патрабуецца.

Прапрацоўка прамфінпляну ў цэхах, зьменах, брыгадах і паасобных групах рабочых не праводзілася. У выніку прамфінплян да рабочага месца не даведзены.

Улік сацспаборніцтва пастаўлены дрэнна. У радзе цэхаў няма месячных вынікаў спаборніцтва. Удзельнікі спаборніцтва ня ведаюць якія ў іх дасягненьні і недахопы. Зводкі ня вывешваюцца. Інжынэрна-тэхнічная сэкцыя мала дапамагае. Яе «дапамога» вызначылася толькі ў тым, што ІТС вылучала свайго прадстаўніка ў цэхі і брыгады. Але і той амаль ніякай практычнай работы не праводзіў.

Нават улік рабочых, якія прымалі ўдзел у сацспаборніцтве, і ўдарнікаў знаходзіцца не на належнай вышыні.

Інфармацыі ўдарных цэхаў, брыгад, зьмен і асобных груп—удзельнікаў сацспаборніцтва—на цэхавых і зьменных сходах ня ставіліся. Былы толькі даклады і гаспадарнікаў на агульных сходах і гэтым уся работа па сацспаборніцтве абмежавалася. Самакантроль ударных цэхаў, брыгад, зьмен і асобных ударнікаў адсутнічаў.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі да гэтага часу ня здолелі стаць на чале кіраўніцтва сацспаборніцтва. Мясцком і вытворчая намісія аддзелу цягі, а таксама Вучкпрафсож яшчэ не разгарнулі, як належыць, свае работы, ня здолелі яе перабудаваць так, каб уся яна была падпарадкавана інтарэсам выкананьня прамфінпляну. Ёсьць шмат недахопаў, якія можна было-б лёгка зьнішчыць пры належным кіраўніцтве. Начыць пры, прагулы за апошнія два месяцы—люты і сакавік—складаюць 3,6 %. Або другі факт: у першым квартале хворых паравозаў было на вучастку 10,7 проц., а ў другім квартале—13,9 проц. Ці дапушчальна, каб на вучастку быў такі вялікі процант паламаных паравозаў?

Гэта толькі **папярэднія даныя**, якія пры праверцы выявяцца сацспаборніцтва кідаюцца ў вочы.

Толькі ў самы апошні час, у сувязі з гадавінай сацспаборніцтва, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі пачынаюць раскалыхвацца. На мясцкому цягі арганізавана 9 праверачных брыгад, у якія ўваходзіць чалавек 80. Арганізавана таксама ЧКК. Але тэмп работы невыстарчальны. **Прафарганізацыі ўсё яшчэ адстаюць.**

Брыгадзір ЦСПСВ і ВСНГБ **Л. Хвасьцюк.**

НА 35.000 РУБ. БРАКАВАНЫХ ГУЗІКАЎ—

ВОСЬ ШТО ВЫЯВІЛА САМАПРАВЕРКА НА ГАЛЯНТАРЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ

Праверачныя брыгады па галянтарэйнай фабрыцы «**Бепаруска**» канчаюць сваю работу. Трэба адзначыць, што праверачныя брыгады выкрылі шмат недахопаў у рабоце цэхаў.

У цэху па вырабе гузікаў брыгада выкрыла дрэннае кіраўніцтва, адсутнасьць адзінаначальня, частыя прастоі машын на віне адміністрацыі, кепскае выкарыстаўваньне сырцу і г.д. Асабліва ўвагі заслугоўвае выкрыты брыгадай факт непамерных колькасьці браку. **На складзе знайшлі бракаваных гузікаў на суму каля 35.000 руб.**

У гэтым-жа цэху брыгада выявіла некалькі іржэ-ўдарнікаў, якія зрывалі сацспаборніцтва. «Ударнік» **Клімчук** даваў вялікую колькасьць бракаваных гузікаў, некалькі разоў спазьніўся на работу, мае некалькі вымоў за дрэнныя адносіны да работы. «Ударніца» **Сурпіна** таксама дрэнна адносіцца да работы, не жадае перарабляць прадукцыю, часта спазьняецца на работу і г. д. Калі брыгада паставіла гэта пытаньне на сходзе рабочых, **Клімчук і Сурпіна былі выключаны з ліку ўдарнікаў.**

У цэху на вырабе грабянёў брыгада выкрыла таксама многа недахопаў. Гэты цэх мог-бы выканаць праграму на 100 проц. Але цэх адчувае нястачу ў цолюлёзе і з гэтае прычыны ў цэху здараюцца частыя прастоі.

Брыгада ўстанавіла, што дзякуючы сацспаборніцтву прадукцыйнасьць працы ў цэху на вырабе трабянёў была узьнята на 25 проц.

Брыгада зазначае, што прапановы рабочых ня выкананыя. У некаторых аддзяленьнях, ня гледзячы на пастанову агульнага сходу, няма спытканьня, дзе рабочыя павінны запісваць свае прапановы.

А. Н.

„Ударненькі цашок"

Рамонтна-мэханічны цэх фабрыкі «**Днепроўская мануфактура**» павінен адыграць вялікую ролю ў выкананьні прамфінпляну на фабрыцы. Ад хуткасьці рамонту варштатаў залежыць скарачэньне прастояў і павялічэньне вырабу прадукцыі.

Рамонтны цэх абвясьціў сябе ўдарным. Але гэта слова зьяўляецца для рамонтнага цэху толькі шыльдай, над якой хаваецца гультайства вышэйшай маркі.

Гэтымі днямі мэханік **Батшэвіч** прынёс у рамонтны цэх галаваломку: як скласьці крыж з 8-мі асобных частак. Над гэтай галаваломкай сьлесары **Драбкін і Фарбэр** сядзелі каля тыдню. Цяжка падлічыць колькі рабочага часу яны патрацілі на вырашэньні гэтай загадкі. Але вядома, што рамонт варштатаў за гэты тыдзень ішоў значна марудней, чым звычайна. Адміністрацыя аб гэтым ведала, але ніякіх мер ня прыняла.

Гэта толькі адзін з многіх фактаў, якія характарызуюць сапраўдны «тэмп» работы цэху. Вось яшчэ адзін факт.

Хтосьці прынёс у майстэрню ось ад вэлёсыпэду для рамонту. Загадчык цэхам Фэйгінаў катэгарычна забараніў рабіць прыватную работу ў рабочы час. Але мэханік—чалавек упарты, ён запрапанаваў неадкладна вызваліць такарны варштат і ось вэлёсыпэду сьлі адточана. На гэта пайшло 7 гадзін рабочага часу. За тое часткі да фабрычных варштатаў, якія трэ' было тэрмінова адрамантаваць засталіся ляжаць і папсаваны варштат (крэц-шпуль) меў каля 7-мі гадзін прастою.

Наогул, у сьлесарным цэху ня ўсё добра. Рвацтва наглядаецца на кожным кроку. Калі працуюць зьдзельна за тарыфную плату, дык работа кіпіць, а калі працуюць ня зьдзельна, дык у цэху адчуваецца халадок. У такі дзень на сьнеданьне трацціца паўгадзіны і больш.

Маладая зьмена—вучні дрэнна навучаюцца. Вучням ніхто не паказвае, як трэба працаваць.

Дырэктыва аб адзінаначальні не праводзіцца. Мэханік зусім ня лічыцца з распараджэньнямі загадчыка. Тэхнічны кіраўнік фабрыкі, калі яму патрэбны сьлесары, забірае іх бяз згоды загадчыка цэхам. Загадчык цэхамі, вылучэнец, не сустракае падтрыманьня з боку адміністрацыі.

Наогул цэх патрабуе энэргічнай устрасткі. І ў першую чаргу трэба зьняць з гэтага цэху назву «ударны». Нельга дапускаць, каб гэтай гапаровай назвай злоўжывалі гультаі.

Чалночнікаў.

Ганебная работа

Экспартнае заданьне выканана на 16 проц.

На Мазырскім заводзе «**Прапетары**» у сацспаборніцтве прымаюць удзел толькі 30 проц. рабочых. Але гэта спаборніцтва зьяўляецца адвабкім, бо адміністрацыя зусім ня лічыць для сябе абавязковым выконваць умовы на сябе абавязкі. Асабліва дрэнна з забесьпячэньнем заводу сырцом. 20-га сакавіка завод ледзь зусім ня спыніўся, але дзякуючы таму, што рака ўскрылася, удалося падвезьці крыху сырцу і завод зноў быў пушчаны. І да гэтага дня былі выпадкі, калі завод працаваў з перабоямі. Ня гледзячы на шматлікія сыгналы і заявы рабочых, адміністрацыя не прымала рашучых мер для палянпшэньня забесьпячэньня. Былі і іншыя прычыны перабояў у рабоце. Нягода дзіўнага, што пры такіх абставінах прастоі на заводзе у параўнаньні з мінулым годам павялічыліся **на 390 проц.**

Гэта спрыяла таму, што гаданае заданьне па экспарце—14.010 куба-мэтраў выканана толькі **на 16 проц.** (2.229 куба-мэтраў).

З боку рабочых таксама няма патрэбнай зацікаўленасьці сацспаборніцтвам. Дысцыпліна кулгае на абодвух нагах. Растуць прагулы. Толькі ў чацьвертым квартале мінулага году было ўсяго 15 прагулаў, дык у першым квартале было ўжо 38, а за першыя два месяцы другога кварталу—36. І гэта на 167 рабочых.

Таксама часты спазьненьні. Ёсьць выпадкі сымуляцыі. Заводзкі доктар выдае водпускі ўсім незаможна ад таго, ці хварэе чалавек, ці не. Даволі, калі рабочы паскарэдзіцца, што ён хворы. Ёсьць выпадкі выхаду рабочых з працы бязусякіх прычын.

Ударніцтва ахоплена толькі 30 проц. рабочых. Партыйная і камсамольская арганізацыі ня толькі ня прымаюць мер да барацьбы з порагамі працадысцыпліны, але і самі не паказваюць добрых прыкладаў. З 30 партыйцаў ударнікамі лічыцца толькі 11 чалавек, рэшта ня прымае нават удзелу ў сацспаборніцтве. Сакратар парт ячэйкі т. Рубінаў кажа «навошта партыйцам запісвацца ў ударнікі, калі яны нават ня недаюць, якія ўзяць на сябе абавязкі».

Тое-ж самае з камсамольцамі. З 30 камсамольцаў толькі 19 зьяўляюцца ўдарнікамі.

Усё-ж трэба адзначыць, што частка рабочых з вялікім энтузіязмам змагаецца за выкананьне прамфінпляну. Яны добраахвотна зьмяняюць расцэнкі, зьмяншаюць прастоі. Некаторыя брыгады, як напрыклад, брыгада т. Тобала, нераўны канала заданьне, гэятае на сандагавары. Гэта сьведчыць аб тым, што рабочыя ўсьвядомілі задачы, якія стаяць перад рабочай класай, але мясцовыя арганізацыі ня здолелі выкарыстаць ініцыятыву перадавых рабочых для мабілізацыі энэргіі ўсяго калектыву.

М. Вапельнік.

Работа з беднатою не праводзіцца

(З лістоў селькораў)

◎ Група батрацтва і беднаты, якая арганізавана пры калгасе імя Чарякова, Віцебскага раёну, праводзіць сваю работу няплянава. Ёсьць выпадкі, калі пасобныя сераднякі імкнуцца затушаваць беднату кажучы: «Мы ўсе ў калгасе роўныя і няма чаго нас падзяляць».

Пры калгасе «Бяроза» група беднаты яшчэ не арганізавана. Ніякай работы з батрацтвам і беднатой не праводзіцца.

І. КУРГАН.

◎ Па Чарапоўшчынскім сельсавеце, Вушацкага раёну, на Полаччыне, сталай работы з беднатой не праводзіцца. Камітэт узаемадапамогі ніякай дапамогі беднаце не дае. **На пасёлку «Чырвоная горка» жывуць бяднячкі Мурашкі,** якія ня маюць хлеба, але ніхто ня дбае, каб дапамагчы ім. Арганізацыя калгасаў у сельсавеце праводзіцца без папярэдняй работы з беднатою.

КАЗЛОЎ.

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЙ АСЬВЕТЫ

Дом Камасьветы ў нашых умовах — арганізацыя яшчэ зусім новая. Да сьнежня месяца існаваў габінэт агітпрапаработніка зусім асобна ад клюбу Карла Маркса. Кожны меў сваю бібліятэку, кожны праводзіў сваю работу самастойна.

Плянавая работа пачалася з дня рэарганізацыі агітпрапабінэту ў навучальна-мэтадычную частку Дому Камасьветы.

Дом Камасьветы паставіў перад сабой задачу абслугоўваньня партыйна-камсамольскага актыву, дапамогі актыву ў яго практычнай рабоце, узьнясьця кваліфікацыі прапагандыстага.

Работа Дому падзяляецца на дзьве часткі: на масавую і вучэбна-мэтадычную работу. За гэты непялікі час мы мелі 19 дакладаў, 7 лекцый, 5 вечароў для партыйнага актыву. Даклады і лекцыі наведалі ў сярэднім 500 чал. Вучэбна-мэтадычная частка арганізавала габінэты: культурны і прапаганды, габінэт агітацыі масавай работы, габінэт арганработы. Кожны з гэтых габінэтаў падзяляецца на аддзелы.

Рэарганізавана і бібліятэка клюбу, чытальня. Навуковая бібліятэка-чытальня працуе штодзенна з 10 раніцы да 10 гадзін увечары без перапынку.

Рэарганізацыя работы Дому Камасьветы бязумоўна павялічыла наведваньне Дому. Калі ў лістападзе г. г. Дом наведала 293 чал., дык у сакавіку мы маем 2.542 наведвальнікаў.

У Доме мы маем індывідуальную кансультацыю на гістарычных, эканамічных дысцыплінах, на гістмату, на антырэлігійнай прапагандзе і па агульна-асьветных дысцыплінах. Уся гэта кансультацыя забясьпечана лепшымі кансультантамі. Пры доме праводзіцца кансультацыя па мэтодыцы, бягучых пытаньнях.

Тэарытычная вучобай партактыў у гэтым годзе не займаўся.

Пры доме зарэгістравана ўсяго 30 асоб па індывідуальным навучаньні і 13 асоб на завочным. Скліканы дыспут аб вучобе партактыву не адбыўся з-за малага ліку людзей. Ня лепшая справа і з вясковым актывам. За ўвесь час існаваньня Дому мы ня маем ні аднаго пратаколу для рэцэнзаваньня, ня гледзячы на тое, што Домам разасланы лісты КП(б)Б і зроблены пэрсанальныя напаміны таварышом, якія займаюцца самаадукацыяй.

Групавой кансультацыяй ахоплена 1.057 чал. У сярэднім на кожную кансультацыю мы маем 44 чал. Гэта форма бязумоўна сябе апраўдала.

У Доме Камасьветы праводзіцца вялікая работа і па праграма-мэтадычнай частцы. За гэты тэрмін былі распрацаваны праграмы для батрацкіх курсаў, для курсаў фабрычна-заводзкага актыву, для ўступаючых у партыю, для курсаў рабочых саўгасаў, для падрыхтоўкі жанчын—кіраўнікоў ясьлямі. Акрамя таго распрацаваны мэтадычныя заданьні для ўсіх заняткаў адзінай партшколы і ленінскага партнабору.

Рэгулярна працуюць сэмінары для рабочых прапагандыстых, створана 6 гурткоў. За апошні месяц Домам Камасьветы арганізован партпрафгаспадарчы габінэт па гарбарні «Бальшавік». Габінэт забясьпечан літаратурай, праграмамі, мэтадычнымі распрацоўкамі, кансультацыяй.

Якія задачы ставіць Дом Камасьветы ў вясновa-летні час? За гэты час на навукова-мэтадычнай частцы будуць падабраны і перапрацаваны праграмы, мэтадычныя распрацоўкі для летніх курсаў перападрыхтоўкі прапагандыстых і партактыву, праграмы, мэтадычныя распрацоўкі для індывідуальных завочных заняткаў, мэтадычныя распрацоўкі па рацэньнях Менскай акрпартканферэнцыі, XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), будзе падабрана праграма і літаратура для таварышоў, якія рыхтуюцца для наступленьня ў навучальныя ўстановы. Да ўсіх гэтых праграм будзе распрацоўвацца мясцовы матар'ял, а таксама мэтадычныя ўказаньні на скарыстаньні бягучага матар'ялу.

Дом ставіць перад сабой задачу — распрацаваць і выдаць сэрыі дыяграм па прамысловасьці БССР, калгасным руху, культурным і партыйным будаўніцтве БССР і Менскай акругі для сеткі партасьветы. Таксама будзе праводзіцца групавая кансультацыя па пытаньнях пастанаў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б), па бягучых палітычных мініях і чарговых задачах партыі, па пытаньнях сыстэмы партасьветы на будучы навучальны год, па пытаньнях сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Будзе працаваць індывідуальная кансультацыя, будзе наладжана плянавая работа сэмінараў, агітатараў, кіраўнічых гаспадарчых працаўнікоў прадпрыемстваў, па вывучэньні агарнага пытаньня. У летні час бібліятэка забясьпечыць перасоўкамі габінэты на прадпрыемствах, наладзіць выдачу навуковай літаратуры на дом, вызначаючы для гэтага спэцыяльны фонд.

Па масавай рабоце будзе праведзен рад дакладаў, вечароў партактыву, дыспутаў, лекцый. Улетку Дом Камасьветы арганізуе партгабінэты на 8 буйнейшых прадпрыемствах Фрунзаўскага і Кастрычніцкага раёну, правядзе арганізацыю партгабінэтаў на усіх раёнах Меншчыны, распрацуе палажэньне аб раённых, а таксама аб саўгасьветы і калгасных партгабінэтах. Дом Камасьветы арганізуе прыклады партгабінэт у калгасе на Ўсебеларускай с.-г. выстаўцы, арганізуе прыкладны партгабінэт у самым буйным калгасе Меншчыны.

Любін.

4-га мая г. г. а 6 гадз. увечары склікаецца

аб'яднаны пленум Мен. АК і АКК КП(б)Б.

З ПАРАДКАМ ДНЯ

1. Справаздача АК КП(б)Б (т. СЛАВІНСКІ).
2. Аб далейшых задачах у галіне калектывізацыі сельскай гаспадаркі (т. ТАМАШЭЎСКІ).
3. Вынікі чысткі партарганізацыі т. (ДАМБРОЎСКІ).
4. Пытаньні VIII-ай партканфэрэнцыі.

Сакратар Мен. АК КП(б)Б СЛАВІНСКІ.

Па Савецкай Беларусі

Каштоўныя рэчы—у фонд індустрыялізацыі

М-ка Талачын. Атульны жаночы дэлегацкі сход мястэчка Талачына, заслухаўшы даклад аб індустрыялізацыі краю, пастанавіў правесьці збор сярэбраных і мядзяных рэчаў у фонд індустрыялізацыі. Тут-жа, на сходзе, жанчыны-дэлегаткі прынесьлі з сабою розныя каштоўныя рэчы на 350 руб. Усе гэтыя каштоўнасьці перададзены ў Аршанскі акруговы банк.

Зрываюцца загатоўкі бульбы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Для забесьпячэньня рабочых цэнтраў і патрэб насёўкампаніі Бабруйшчына павінна даць звыш 1 млн. пуд. бульбы. Пакуль што выканана толькі 20 проц. заданьня. Загатоўчыя арганізацыі мала ўвагі ўдзяляюць гэтай загатоўцы. Рэкорд бязьдзейнасьці пабіла сыстэма Паляводсаюзу, якая выканала толькі 4 проц. пляну.

За зрыў загатовак бульбы акргандаль аддае пад суд старшынь Слуцкага і Чырвона - Слабодзкага райпаляводсаюзаў.

Шырокая рабочая канфэрэнцыя—у Мазыры

МАЗЫР. (Наш кар.). У Мазыры адбылася шырокая агульна - гараджская рабочая канфэрэнцыя.

Канфэрэнцыя многа ўвагі ўдзяліла пытаньню аб выкананьні прамфінпляну за першае паўгодзьдзе 1929-30 году. З вялікім дакладам выступіў старшыня акрпрафбюро тав. **Катлярскі.**

Канфэрэнцыя адзначыла, што прамфінплян амаль на ўсіх прадпрыемствах не даведзены да цэху і варштату.

Пастановы зьезду ўдарнікаў не працоўваюцца на рабочых сходах.

У спрэчках выступіў старшыня ЦВК БССР тав. **Чарвякоў,** які спыніўся на значэньні прамфінпляну ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Конкурс на лепшы калгас

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Прэзыдыум Гомельскага АВК вылучыў акруговую камісію для правядзеньня конкурсу, арганізаванага газэтай «Савецкая Беларусь» на лепшы калгас. У камісію ўвайшлі загадчык акрза, старшыня акрсалгассаюзу і рэдактар «Полесской Правды».

Ня выконваецца пастанова ЦВК СССР

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). ЦВК СССР 13-га красавіка выдаў пастанову аб нацыяналізацыі прыватна - ўласьніцкіх суднаў. У Барысаве ў руках прыватнікаў захавалися шмат рэчных баржаў і суднаў. Між тым, Барысаўскі гарсавет перашкаджае ажыцьцяўленьню пастановы ЦВК і натурае прыватнікам, якія распрадаюць сваю маемасьць.

Пабудова тэатру-кіно ў Воршы

ОРША. (Наш кар.). Прэзыдыум АВК зацьвердзіў умовы конкурсу на пабудову ў Оршы тэатру-кіно. Устаноўлена 5 прэмій. Лепшы праект атрымае першую прэмію ў 3.000 руб. Кіно-заля разьлічана на 800

МЕНСК

Недапушчальныя адносіны да пажарнай аховы

Фабрыка вырабу капылоў «Рабочы» (Нова-Барысаў) на выпалак пажару мае тры пажарныя краны ад паравой помпы, 2 гідранты і адну перасовачную помпу, а рукаваў і бочак няма.

Пры фабрыцы ёсць пажарная дружына, але няма пакоя для дзяжурных.

ВСНГБ на сытуацыі рабочых у «Зьвязду» аб дрэнным пажарным захове адпісаўся, спасылаючыся на тое, што забеспячэньне заводзкіх пажарных дружын перадана непасрэдна заводам, а аб начальніку дружыны.

Пажарная інспэкцыя ВСНГБ, якая 6 студзеня абсьледавала фабрыку, не зьвярнула увагі на стан пажарнага інвэнтару, а толькі канстатавала, што фабрыка ва ўмовах сваёй вытворчасьці мае шмат драўніны, дробных стружак, што стварае небясьпеку ў адносінах пажару. Камісія забараніла курыць на фабрыцы і запрапанавала адпаведна абсталяваць памяшканьне, якое адведзена для курэньня.

Паводле думкі пажарнай інспэкцыі, абсталяваньне пажарнага дэпо дзяжурным пакоем зусім не патрэбна, бо блізка знаходзіцца дэпо фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна». Капітальныя выдаткі на пажарную ахову таксама інспэкцыя лічыць ня мэтазгоднымі, бо фабрыка «Рабочы» ў канцы лета закрываецца, а абсталяваньне перадаецца фабрыцы «Камінтэрн».

Бадай «мудрыя» работнікі з пажарнай інспэкцыі ВСНГБ лічаць, што набыцьцё некалькіх бочак і рукаваў патрабуе капітальных выдаткаў і, забыліся на тое, што краны і помпы, якія ёсьць, бяз гэтых прылад нікуды ня варты.

ВСНГБ павінен неадкладна прыняць меры для праверкі пажарнага інвэнтару на ўсіх заводах, а таксама арабіць захады да набыцьця фабрыкамі і заводамі неабходнага інвэнтару.

Пноў.

Прыём у ВНУ ў гэтым годзе

З мэтай рэгуляваньня сацыяльнага складу студэнтаў ВНУ, тэхнікумаў і рабфакаў Савет Народных Камісараў БССР устанавіў наступныя нормы прыёму ў ВНУ ў 1930-31 навучальным годзе.

У ВТНУ, хэмфак, інжынэрна-эканамічны факультэт — 75 проц. рабочых і іх дзяцей, 17 проц. беднякоў, калгасьнікаў, сераднякоў і іх дзяцей, 5 проц. дзяцей спэцыялістых і 3 проц. служачых і іх дзяцей.

На пэдфак БДУ і пэдінстытуты—40 проц. рабочых, 45 проц. беднякоў, калгасьнікаў, сераднякоў і іх дзяцей, 9 проц. настаўнікаў і іх дзяцей, 3 проц. дзяцей спэцыялістых і 3 проц. служачых і іх дзяцей.

У сельгасакадэміі і вэтэрынарны інстытут — 45 проц. рабочых, батракоў і іх дзяцей, 45 проц. беднякоў, калгасьнікаў, сераднякоў і іх дзяцей, 5 проц. настаўнікаў і служачых, 5 проц. дзяцей спэцыялістых.

На мэдфак БДУ — 50 проц. рабочых, батракоў і іх дзяцей, 26 проц. беднякоў і г. д., 6 проц. фельчароў, 5 проц. дзяцей спэцыялістых і 3 проц. служачых.

На факультэты савецкага будаўніцтва і народнай гаспадаркі БДУ — 60 проц. рабочых, 30 проц. беднякоў і г. д., 5 проц. дзяцей спэцыялістых і 5 проц. служачых.

Спыніць шматлікія абсьледваньні

Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і Калегія НК РСІ БССР выдалі пастанову аб упарадкаваньні абсьледваньня прадпрыемстваў.

Ня гледзячы на дырэктывы партыі аб зьнішчэньні шматлікіх кантрольных абсьледваньняў, дасюль маюць месца абсьледваньні рознымі ўстановамі і арганізацыямі прамысловых, сельска-гаспадарчых і кааперацыйных прадпрыемстваў. Прапануецца ўсім дырэктарам і загадчыкам прамысловымі прадпрыемствамі, а таксама праўленьням калгасаў, кіраўніком саўгасаў не дапускаць ніякіх абсьледвацеляў без дазволу і візы органаў РСІ.

Дакументы на абсьледваньне рэспубліканскіх прадпрыемстваў павінны мець візу НК РСІ БССР, абсьледвацелі прадпрыемстваў акруговага значэньня павінны мець дазвол акрРСІ, дакументы на абсьледваньне прадпрыемстваў саюзнага значэньня павінны абавязкова візу НК РСІ СССР.

Камгас ня хоча, а жакт ня можа

Муніцыпалізаваныя дамы ў Менску адразу-ж засталіся без гаспадарчага нагляду. Камгас не зварачаў ніякай увагі на шматлікія заявы кватарантаў аб ачыстцы памыйных ям і ўборных. Гэтыя дамы павінны быць пераданы жактам, а таму камгас не хацеў траціць сродкаў на ачыстку. Але камгас ня ўлічыў таго, што з пачаткам будаўнічага сэзону і сяўбы можа не хапіць цягавай сілы. Гэта якраз і здарылася. Пасьля перадачы дамоў жактам, апошнія таксама не прыступаюць да ачысткі, спасылаючыся на «аб'ектыўныя ўмовы».

Напрыклад, сакратар жакту № 12 на запытаньні кватарантаў наконт ачысткі, заявіў, што ён наогул ня ведае, што будзе з ачысткай, бо цяпер няма цягавай сілы. Між тым, ачыстка памыйных ям і ўборных не рабілася ўжо паўгода.

Такое становішча, у сувязі з наступленьнем вясны, пагражае ўзьнікненьнем эпідэміі. Гарсавет павінен зьвярнуць на гэта ўвагу і ўжыць адпаведныя меры.

Г.

СЬЦЯГІ да 1-майскіх сьвят

ПРАДАЮЦЦА ў ТАВАРЫСТВЕ „Прыхільнік дзяцей" —Савецкая, 40, і ў магазыне т-ва—Ленінская, 26.

ЧАРГОВЫ НУМАР ПАС. „ПРАФРУХ", прысьвечаны 1-му маю, выйдзе ў аўторак 29 красавіка.

Новы склад прэзыдыуму ВСФКБ

24-га красавіка адбыўся пашыраны пленум ВСФК Беларусі. Пленум заслухаў даклад адказнага сакратара ВСФК СССР тав. Грыгор'ева аб выніках пленуму вышэйшага савету фізкультуры СССР і абраў прэзыдыум ВСФКБ з 19 асоб.

У склад прэзыдыуму ўвайшлі т. т.: Рыжоў, Хацкевіч, Леў, Ягораў, Шоламаў, Нікіцін, Ульянаў, Клімовіч і інш. Старшынёю ВСФКБ абраны **т. Рыжоў**, намесьнікам старшыні — тав. Леў і адказным сакратаром — **т. Нікіцін.**

ЗОРНЫ ВЭЛЁПРАБЕГ

У зьвязку з XIII-м зьездам КП(б)Б, ЦСПСБ і вышэйшы савет фізкультуры арганізуюць зорны вэлёпрабег прадстаўнікоў ад усіх округ БССР. У прабезе прыме ўдзел каля 100 вэлёсыпэдыстых, якія прыбудуць у Менск у часе работы XIII-га зьезду і выступяць з рапартам аб удзеле фізкультурнікаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Павялічаны водпуск прадуктаў грузчыкам

МЦРК павялічыў норму водпуску прадуктаў грузчыкам, якія будуць атрымліваць па 1.200 грам хлеба ў дзень, 2 кілёграмы селядцоў і 2 з паловай клг. круп у месяц.

Пашырэньне сеткі мэдычных устаноў

Пры НК аховы здароўя адбылася нарада з удзелам прадстаўнікоў Чырвонага крыжу і камітэту ўзаемадапамогі па пытаньні пашырэньня сеткі мэдычна-санітарных устаноў, якія знаходзяцца пад загадам грамадзкіх арганізацый (Чырвоны крыж і камітэт узаемадапамогі). Нарада пастанавіла адкрыць рад новых мэдыка-санітарных устаноў у гарадох Беларусі, якія будуць абслугоўваць гарадзкую беднату дармова, а ўсе іншыя групы насельніцтва за плату, якая будзе дыфэрэнцыявана.

Курсы па падрыхтоўцы чырвоных дырэктараў

ВСНГ БССР адкрывае ў Чэрвені курсы па падрыхтоўцы чырвоных дырэктараў, іх намесьнікаў, загадчыкаў буйных цэхаў прамысловых прадпрыемстваў. Курсы разьлічаны на 100 чал. і будуць адкрыты ў Менску.

Розыгрыш 4-ай авіялётарэі

2-га і 3-га мая ў клюбе мэталістых будзе праводзіцца розыгрыш тыражу 4-га разраду 4-й авіялётарэі. Таварышы, якія жадаюць прысутнічаць на розыгрышы, павінны падаць заяўкі акрсавету Асоавіяхіму праз свае ячэйкі не пазьней 28-га красавіка.

Збор самаабкладаньня па Меншчыне

Паводле вестак Менакрфа, збор самаабкладаньня па Менскай акрузе праходзіць вельмі дрэнна. На 15 красавіка заданьне па самаабкладаньні ў Меншчыне выканана толькі на 77 проц. Сабраныя сумы выкарыстаны ўсяго на 19 проц. У Бярэзінскім раёне самаабкладаньне сабрана толькі на 80 проц., а скарыстана — на 7 проц., у Вягомльскім раёне заданьне па самаабкладаньні выканана на 87 проц., скарыстана-ж з сабраных сум толькі 4 проц.

Былі выпадкі, калі сяляне адмаўляліся праводзіць самаабкладаньне, матывуючы гэта тым, што ўсё роўна грошы, сабраныя па самаабкладаньні ляжаць без карысьці.

Навіны МЦРК

— МЦРК пачаў адпускаць пайшчыкам па 500 грам цатакі на наборную кніжку і па 1 літры дэнатурату.

Крамы МЦРК у першамайскія дні. 30 красавіка ўсе крамы працуюць нармальна. 1-га мая ўвесь гандаль будзе спынен. 2-га мая працуюць толькі наступныя хлебныя крамы: 160, 131, 162, 125, 165, 114, 39, 133, 106, 43, 120, 121, 154 і хлебнае аддзяленьне крамы № 40. Крамы адпускаюць хлеб з 9 да 5 гадз. увечары ўсім пайшчыкам.

— МЦРК узьняў перад ЭКАНА БССР хадайніцтва аб **пабудове ў Менску яшчэ аднаго хлебазаводу**, бо першы завод і яго аддзяленьні ня могуць задаволіць усіх патрэб гораду ў хлебе. Пабудову новага заводу мяркуецца распачаць у 1931 годзе.

Кіно--у першамайскія дні

Белдзяржкіно распрацавала канкрэтны плян сваёй работы ў першамайскія дні. 1-га мая ў кіно-тэатрах «Інтэрнацыянал» і «Пралетары» будуць даны 3 кіно-сэансы для рабочых. У кіно «Юны Піянэр» адбудуцца 2 дзённыя сэансы. Апрача таго, адбудзецца адзін сэанс для дзяцей у кіно «Інтэрнацыянал» ад 5 да 7 гадз. Кіно «Культура» дае 1-га мая дармовы сэанс для Чырвонай арміі. Па ўсіх акраінах гораду Менску будуць дэманстравацца: хроніка і дробна-мэтражныя карціны на аўта-кіно-перасоўках.

1 мая вечарам на пляцы Волі таксама будуць паказваць кіно-карціны. Першамайскія ўрачыстасьці будуць засьняты на кіно-стужку.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

23 красавіка ў 18 з паловаю гадз. у памяшканьні Дому Камасьветы адбудзецца зьлёт рабочай моладзі Кастрычніцкага раёну з наступным парадкам дня:

1. Чарговыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва і ўдзел моладзі (дакл. старшыня ЦСПСБ т. Рыжоў);

2. Рапарты: ударнай брыгады, ударнай вытворчай камуны і ўдарнага цэху. Пасьля зьлёту канцэрт.

АД ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б

Сёньня адбудзецца: другі куставы сход раёну наступных ячэек: Белдзяржбуду, Буд. аддз. БЖС, Гандальбуду, саюзу будаўнікоў, цагелянь, Стромтрэсту, Беллайгандлю, ВСНГ, Лесбелу, заводу «Дрэвааапрацоўшчык», ЦВК, Белдартрансу, Аўтакіраўніцтва. Абкамтрэсту, СНК і ЦСК.

Парадак дня: даклад РК аб рабоце. Пач. у 18 гадз. у клюбе АВК (пляц Волі). Усе партыйцы паказаных ячэек павінны зьявіцца своячасова.

Трэці куставы сход ячэек: друкарні БДВ, п.-к. «Паліграф», друкарні «Зьвязда», БАН, Белдзяржвыдавецтва, Наркамасьветы, саюзу працасьветы, БДТ2, Белдзяржкіно, Польпэдтэхнікуму, Камвузу, палітэхнікуму, музтэхнікуму і белпэдтэхнікуму.

Парадак дня: даклад РК аб рабоце. Яўка членаў паказаных ячэек абавязкова. Пач. у 18 гадз. у клюбе друкароў (Ленінская, 13).

СЁНЬНЯ

Сёньня, 27-га красавіка а 7 гадз. увечары ў габінэце старшыні праўленьня МЦРК тав. Каца адбудзецца пасяджэньне **цэнтральнай камісіі па аглядзе грамадзкага харчаваньня.**

На пасяджэньне павінны зьявіцца наступныя таварышы:

Аддэрштэйн — ЦКК - РСІ; Васільлева і Мірынгоф — ЦСПСБ; Мазэлеў — Белкаапсаюз; Кац, Альняровіч, Залічпак і Вялікаселец — МЦРК; Рацэвіч—ЦК ЛКСМБ; Завуськінскі — зав. «Камунар»; Шапашнікаў — завод «Дрэвааапрацоўшчык»; Аін — гарбарня «Бальшавік»; Пігулеўскі — гута «Пралетары»; Андропаў — завод «Энэргія», Бычкоўскі — вагонныя майстэрні МБВ чыг.; Кэн — газ. «Рабочий»; Скакальскі — газ. «Савецкая Беларусь»; Каганская — газ. «Чырвоная Зьмена» і прадстаўнік газ. «Акцябр».

Запрашаюцца прадстаўнікі рабочых брыгад.

Дом Камасьветы. У 19 гадз. (пак. № 21) — індывідуальная кансультацыя па ленінізьме т. Саевіча.

Дом Асьветы. У 19 гадз. адкрыты камсамольскі сход школьнай цэх'ячэйкі.

Заняткі антырэлігійнага унівэрсытэту ў памяшк. нэрвовай клінікі (Сьвярдлоўская, 13). Пач. у 18 гадз. 15 мін.

Фрунз. РК КП(б)Б. Парада ячэйковых упоўнаважаных «Правды» ў памяшк. РК. Пач. у 19 гадз. Яўка ўпоўнаваж. абавязкова.

Пасядж. прэзыдыуму Фрунзаўскага РК МОПР'у — у 18 гадз. Запрош. актыў.

ЦП саюзу працасьветы. Нарада добраахвотнікаў вытворчага сэктару ЦП саюзу. Пач. у 19 гадз.

Вяч. рабфак (13 аўд.). Парада па пытаньні арганізацыі курсаў для падрыхтоўкі на рабфак. Пач. у 22 гадз. Яўка прадстаўнікоў фабкомаў менскіх прадпрыемстваў абавязкова.

Дом Працасьветы. Сход ячэйкі ЛКСМБ палітасьветных устаноў. Пач. у 8 гадз увеч.

МенАК КП(б)Б. 27 красавіка ў 18 з паловай гадз. нарада па пытаньні Дня друку ў памяшк. АК. На нараду запрашаюцца т. т.: **Асьмоў і Вержбаловіч—«Зьвязда», Якаўлеў і Маёраў — «Рабочий», Шукевіч-Трацьцяноў—«Бел. Вёсна», Дунец — «Акцябр», Шастакоў і Маставы — «Савецкая Беларусь», Джэлюк і Качанская — «Чырвоная Зьмена», Клыс — «Орка», Некрашэвіч — Белдзяржвыдавецтва, Валешка — Цэнтр. выдавецтва, Ліманоўскі—БелАПП, Эфраімскі — «Рабочае Вока», рэдактар газ. «Чырвонае Шыла», Сухаліцкі — «Голас краўца», Пузікаў — «Трактар», Ліпніцкі — габінэт журналістыкі пры Камвузе, Модэль і Любін — Дом Камасьветы, Курцік — ЦК КП(б)Б, Клімковіч—ЦСПСБ, Вішнеўская — АК КП(б)Б, Пятушкоў — Фрунз. РК КП(б)Б, Левіна—Кастрычн. РК КП(б)Б, Мятліцкі — АК ЛКСМБ, Златкін — падыў 2, Калесьнікаў — падыў 7. Яўка абавязкова і без спазьненьня.**

ЗАЎТРА

Дэкадны камвуз. Заняткі па ўсіх трох цыклях у 18 гадз. Лектары—Бомдар, Відра і Стальны.

Рэсп. бюро АРУ. У 19 гадз. у памяшканьні АРУ (Савецкая, 65) — нарада бюро мясцовых груп і ўпоўнаважаных АРУ сумесна з актывам арг.-інстр. сэк-

АД Менскае АКК КП(б)Б. На 28 красавіка на 18 з паловай гадз. выклікаюцца для разгляду справ наступныя таварышы:

Ташкевіч В. М., Арабчык А. М., Пачэпка П. С. і Кудзелік Ю. Ф. — БСКА, Фрусін Я. С. — яч. курсаў дасст., Мэрсон Г. І. — 1-я друкарня, Волаш В. А. — Белдзяржкіно, Якаўлеў С. Я.—мэдфак, Шлегель Н. В. — яч ФЭУ, Нігкевіч Р. Р. і Бараноўскі Я. П. — яч. ЦІП, Бамяранскі А. Я. і Тарашук Ц. А. — яч. ДЭПО таварная, Галоўка Я. П. — яч. эксплёат. пасаж. МВБ, Кваскоў Н. Ф. — вагон. майстэрні, Шчырц Ц. Б. — шклозавод Ігнатовіч Н. А. і Хэйфец Х. І. — яч. абутк. майст.

Павінны таксама зьявіцца сакратары ячэек, у якіх знаходзяцца паказаныя таварышы, і старшыні праверкомаў, якія рабілі чыстку гэтых ячэек.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ДНЯ „ЧЫРВОНАЙ КВЕТКІ".

ПРАЦОЎНЫЯ гор. МЕНСКУ! У дні першамайскіх сьвят Менскі Акруговы Камітэт МОПР'у ПРАВОДЗІЦЬ 1-га і 2-га МАЯ СКАРБОНАЧНЫ ЗБОР з „ЧЫРВОНАЙ КВЕТКАЙ" на карысьць палітзьняволеных і іх сямей

РЫХТУЙЦЕСЯ ДА ДНЯ „ЧЫРВОНАЙ КВЕТКІ".

Мен. АК МОПР'у просіць усіх ячэек МОПР'у г. Менску вылучыць па 4-5 чалав. актывістых для ўдзелу ў скарб. зборы.

УСЕ ўдзельнікі скарбоначнага збору павінны ЗЬЯВІЦЦА ў АК МОПР'у (Савецкая, 87), 30-га красавіка, а 3 гадз. дня для атрыманьня скарбонак, кветак, раёну і дакумантаў.

Мен. АК МОПР'у заклікае для ўдзелу ў скарб. зборы пралетарскае студэнцтва, актыў ЖАКТ'аў, саматужнікаў, дэлегатак Фрунзаўскага і Кастрычніцкага РК і жонак камандзіцкладу Мен. гарнізону.

Для папулярызацыі дня „Чырвонай Кветкі" па гор. Менску Мен. АК МОПР'у арганізуе 30-га красавіка а 5 гадз. увеч. АРГАНІЗАВАНУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ ЎСІХ УДЗЕЛЬНІКАЎ СКАРБ. ЗБОРУ, пад музыкай, факелямі, да якой далучаецца „шествие кандальнікоў", артыстыя БДТ-2 і самакатчыкі

Да арганізацыйнага выхаду ўдзельнікам скарб. збору прыступіць да збору забараняецца.

Для абслугоўваньня зборшчыкаў, у АК МОПР'у устанаўляюцца бесьперапынныя дзяжурствы членаў АК—30 крас., 1-га і 2-га мая.

—УСЕ— НА ДАПАМОГУ МОПР'у!

Грамадзяне г. Менску! Менскі АК МОПР'у.

—УСЕ— НА ДАПАМОГУ МОПР'у!

Менскі Акруговы Камітэт Т-ва па барацьбе з алкагалізмам. Сёньня, а 8 гадз. увеч. у залі Камвузу (Унівэрсытэцкая, 27) наладжвае грамадзкі ДЫСПУТ на тэму: АЛКАГАЛІЗМ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Асноўны дакладчык—рэктар Камвузу т. Саевіч.

Запрашаюцца прыняць удзел прадстаўнікі: АК КП(б)Б, НКАЗдароўя, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, БАН, НКЮ, рэдактары і супрацоўнікі ўсіх газэт, СВБ, НКУС, дактары і прафэсары, рабочыя заводаў і фабрык ад антыалкагольных ячэек прадпрыемстваў і мэдфаку.

ЦП саюзу саўгандальслужачых паведамляе, што 28 красавіка а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу саўгандальслужачых, склікаецца агульны сход працаўнікоў гандлева-кааперацыйных устаноў гор. Менску, з наступным парадкам дня: вынікі агляду становішча полацкай кааперацыйнай арганізацыі (дакл. прадстаўніка ЦКК НК РСІ т. Земнака).

Яўка работнікаў калектываў Белкаапсаюзу, ЦРК, Мен. аддз. Белкаапсаюзу, ТПО, Белпайгандлю, Земляроба і інш. гандлёва-кааперацыйных арганізацый—абавязкова. МК азначаных калектываў шырока інфармаваць прафсаюзныя масы аб гэтым сходзе і забясьпечыць максымальную яўку на сход.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Нядзеля, 27 красавіка, для саюзу працмастацтва

„Калі пяюць пеўні"

Рэшта білетоў у касе тэатру. Пачатак а 8 г. 30 м.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Выш праграмы прыехаўшы з-за мяжы нямецкі вынаходца Джэфрыс дэманструе сваю вынаходку РАДЫЁ-КАРАБЕЛЬ. На экране 1) мастацкі фільм „Армэнкіно" ЗАМАЛУ ў 7 част. 2) культур-фільм ПАМЯЦІ ІЛЬЛІЧА ў 1 част. Дзённыя сэансы: 1 гадз., 3 гадз., 15 м. Каса ад 12 г. дня. Цэны ад 15 к. да 35 к. Веч. вячэрн. сэанс. в 7 г. Каса—ад 5 г.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Мастацкі фільм, вытворч. Ленінгр. Савкіно ХТО ВІНАВАТЫ? Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 15. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса ад 5 гадз. На дзённыя сэансы каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — Мастацкі нямецкі фільм паводле навэлі Стэфана Цвэйга СТРАХ драма ў 8 частках. Штодзённа 3 сэансы. Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр ЮНЫ ПІЯНЭР — КУЛЬТУР-ФІЛЬМ СЫН ГАЎДНЁЗЫХ МАРЭЙ (МОАНА) этнаграфічны ізрыс у 7 частках. Штодзённа 2 сэансы. Пачатак 1-га сэансу а 3 г., 2-га—а 8 г. 30 м. Каса адкрыта з 12 гадз.

КІНО СПАРТАК — Замежны мастацкі фільм ПРАКУРОР ЁРДАН драма ў 7 частках. Пач. 1-га с.—7 г., 2-га с. 9-г., 3-с.—10 г. 30 м. Каса—ад 5 г.

А-ЦЫЯНЭРНАМУ ТАВАРЫСТВУ „БЕЛКОЛХОЗСТРОЙ" ПАТРАБУЮЦЦА старшыя БУХГАЛТАРЫ, якія знаёмы з будаўнічым вучотам, для работы у Гомелі, Магілёве, Борыса, Бабруйску, Мазыры і Менску.

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Зварачацца па адрасе: г. Менск, Савецкая 70, «Белкохозстрой», галоўнаму бухгальтару.

НАВІНКІ ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

Сельска-гаспадарчая бібліятэка.
М. ДРАЗДОЎ.—Культура люцэрны ва ўмовах БССР. Стар. 29. Цана 10 кап.

Бібліятэка бязбожніка.
Ф. ОЛЕШЧУК.—Шкода і выхаваньне актыўных бязбожнікаў Стар. 113. Цана 35 кап.

Царская каторга і ссылка.
А. НАДЭЛЬШТЭЙН.—Абразкі турмы. Стар. 31. Ц. 10 к.
М. ЦЕЦЕРЫН.—У арлоўскую катавальню. Стар. 31. Ц. 10 к.

Мастацкае слова—масам.
Т. ГЛАДКОЎ.—Галаваногі чалавек. Стар. 103. Ц. 35 к.

Вакол сьвету.
Э. ПІМЕНАВА.—Героі паўднёвага полюсу. Стар. 117. Ц. 35 к.

Бібліятэка школьніка.
Д. ЛОНДАН.—Бук—паштовы сабака. Стар. 87. Ц. 30 к.
А. САМАХВАЛАЎ.—Тры здарэньні пад вадою. Стар. 68. Цана 25 кап.
А. ФЭДЭ.—Медзьведзянё Рычык—апавяданьне. Стар. 71. Цана 32 кап.

За буйную сацыялістычную жывёлагадоўлю. Зборнік пастаноў і дырэктыў партыйных і ўрадавых органаў па пытаньнях жывёлагадоўлі. Стар. 86. Цана 25 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., масляк., рельефн анилин. не расплыв. красками. Бисерн., жемчужн. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, коже и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменье рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО. МОСКВА, ул. Дзэр жинского, д. 1.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗАЕМАДАПАМОГІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66

АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. увеч

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нарвовых.

Электра-сьвета-лячэньне і масаж адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, праясьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.

Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.

Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ, атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА" на месцы знаходжаньня ў водпуску, паведаміўшы ў аддзел подпісі газ. «ЗЬВЯЗДА» ВАШ НОВЫ АДРАС. Газэта будзе дасылацца на новым адрасе без асобнай даплаты.

БЕЛТОРФУ ПАТРАБУЮЦЦА бухгальтары, рахункаводы і тэхнікі-будаўнікі —) на выезд. (— Даведацца (вусна і пісьмова) г. Менск, Рэвалюцыйная, № 3. БЕЛТОРФ.

50 к. кошт публікацыі аб згубе дакумента

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДНЫМІ КАСАМІ БССР абвяшчае, што з 15 красавіка г. г. пачалася ПРАДАЖА ВЭЛЁСЫПЭДНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ,

выпушчаных Усесаюзным аб'яднаньнем машынабудаўнічай прамысловасьці, згодна пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ад 26 сакавіка г. г.,

рэалізацыя якіх ускладзена на АШЧАДНЫЯ КАСЫ.

Усіх вэлёсыпэдных абавязацельстваў выпушчана 350 тысяч, з якіх БССР прадастаўлена 7525.

КОШТ ВЭЛЁСЫПЭДУ УСТАНОЎЛЕН У 160 РУБ.

Абавязацельствы выпускаюцца ў 4 сэрыі:

Тэрмін абавязацельства I сэрыі —1 красавіка 1931 г.
« « II « —1 жніўня 1931 г.
« « III « —1 красавіка 1932 г.
« « IV « —1 жніўня 1932 г.

Аплачваюцца абавязацельствы ў РАСТЭРМІНОЎКУ.

Падпісчыкам абавязацельстваў даецца права аплачваць кошт вэлёсыпэду ПОЎМЕСЯЧНЫМІ, МЕСЯЧНЫМІ АБО КВАРТАЛЬНЫМІ (3-х месячнымі) узносамі ў строга вызначаных сумах, у залежнасьці ад сэрыі абавязацельстваў. На сумы, унесеныя для аплаты абавязацельстваў, налічваецца ў карысьць уласьнікаў абавязацельстваў 6 проц. гадавых. Пасьля поўнай аплаты абавязацельстваў уласьнікі іх неадкладна атрымліваюць са складу «ДЗЯРЖШВЭЙМАШЫНЫ» НА РУКІ ВЭЛЁСЫПЭД (выпуску маскоўскага, пензенскага або харкаўскага заводаў)

Падпіска прымаецца ва ўсіх ашчадных касах (акрамя агенцкіх) і філіялаў Дзяржбанку ў межах вызначанай колькасьці вэлёсыпэдаў, прадастаўленай кожнай касе.

Падпіска прымаецца індывідуальная і калектыўная ад асобных калектываў рабочых і служачых і членаў калгасаў.

Вэлёсыпэды выключна МУЖЧЫНСКІЯ.

Абавязацельствы прадаюцца толькі працоўным. Кожны падпісчык мае права толькі на адно вэлёсыпэднае абавязацельства.

Падпіска на вэлёсыпэдныя абавязацельствы заканчваецца 1 ліпеня 1930 г.

Кіраўніцтва ашчадкасамі БССР.

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЮ ПАТРЭБНЫ ДЛЯ РАБОТЫ Ў КІРАЎНІЦТВЕ

ІНЖЫНЭР-будаўнік
ІНЖЫНЭР-мэханік
ІНЖЫНЭР па плянаваньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і абмену вопытам,
ІНЖЫНЭР па плянаваньні вытворчасьці,
ІНЖЫНЭР па ліцейнай оправе,
ІНЖЫНЭР па прафасьвеце,
ІНЖЫНЭР па тэхніцы бясьпечнасьці і аховы працы,
ТЭХНІК-будаўнік,
ТЭХНІК па тэхніцы нармаваньня
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў с.-г. машын і мэт. вырабаў,
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў машына-будаўніцтва

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Прапановы накіроўваць па адрасе: Менск, Рэвалюцыйная, 8, Белмэталяаб'яднаньню, тэлефоны: 10-21, 10-33, 15-79.

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

МОСКВА 55, 2-й ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. № 8

Новое 5-ое издание 1930 г. книги ПРЕДУПРЕЖДЕНИЕ БЕРЕМЕННОСТИ (не прибегая к аборту) А. ОСКИЙ с рисунками в тексте. Цена с пересылкой—1 руб. 60 коп. Заказы и деньги (можно почтовые марки вместо денег) направлять: Москва, центр, Китайгор. ст. п. № 7/40 или почт. ящик 867/40 Книжное дело „Букинеры" И. А. Дувидзон.

ВЯЛЕШЫНСКІ с.-с., Копыльскага раёну Мен. округі выклікае на 30 красавіка гр-ку вёскі Вялешына ВАСІЛЕЎСКУЮ Марыю Антонаву па справе скасаваньня шлюбу в гр. ВАСІЛЕЎСКІМ Францам Уладзімеравым.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Асабов. пасьведч. Падабед Г. А., выд. 2 гадз. сл. экспл. МБВ ч. 191-1

Чл. кн. Фіанда № 51329. Я. Б., выд. Арш. ТПО. 191-2

Паявая кн. № 48.940 Гародніка М. Б., выд. Арш. ТПО. 191-3

Камсам. біл. № 39.666 Гародніка М. Б., выд. Арш. АК ЛКСМБ. 191-4

Прыгар. біл. № 2.855 Шышкова М. А., выд. 4 вуч. пункі МБВ ч. 191-5

Асабов. пасьведч. № 73 Каралёва Ц. Е., выд. к-рай ПЧ ст. Ворша. 191-6

Вуч.-конск. кніжка № 2.641, выд. Арш. РВК, вайск. кн. № 2.663, выд. Арш. ваенкаматам на імя Сідарава П. Ф. 191-7

Бюлетэнь аб хваробе за № 51.006 Бокуца А., выд. амбул. Асінбуду. 191-8

Асабов. пасьведчаньне, выд. ТЧ-3 МБВ ч., разавы біл., выд. ПЧ-4 МБВ ч. на імя Гумінскага К. Р.